Jedno lato jako małe dzieci, jeszcze bez Kazia, spędziliśmy w Kołobrzegu nad morzem. Wtedy to było za granicą, nazywało się Kolberg. Była z nami nasza kucharka Antosia i Mama. Ojciec przyjechał później po nas. Mieszkaliśmy u starej Niemki, która miała nas trochę pilnować, gdy Mama z Antosią szły na targ. My jednak nie chcieliśmy tej opieki i drzwi zamykaliśmy na klucz, więc Niemka zaglądała do nas tylko przez dziurkę od klucza. Pamiętam, z jak wielkim wysiłkiem słaliśmy olbrzymie dwa małżeńskie łoża i układaliśmy niemieckie pierzyny, żeby Mamie zrobić niespodziankę. Ja miałam wtedy 4 lata, a Zdziś 5. Morze i plaże pamiętam mało, musiało być zimno, bo kąpaliśmy się w łazienkach w ogrzanej morskiej wodzie.

Cdn

Нагода

„Для цябе сягоння мая песня дарагая сэрцу, Беларусь…”

Да 100-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта, празаіка, драматурга, вязня сталінскіх лагераў Тодара Лебяды

6 студзеня 2014 года спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння двойчы рэпрэсіраванага беларускага паэта, драматурга, празаіка Тодара Лебяды (Пятра Шырокава) (1914-1970). Таго самага Тодара Лебяды, які ўпершыню ў беларускай літаратуры смела і адкрыта паказаў жахі сталінскага тэрору, знішчэнне беларускай нацыі. Імя літаратара ў 1940-1980-х гадах было забыта і выкрэслена з гісторыі беларускай літаратуры. Але час вяртае таленты з небыцця. Вяртаецца пацціху і творчасць Тодара Лебяды.



Тодар Лебяда 1969 г.

Ён любіў Беларусь, любіў свой родны горад Віцебск, якому прысвяціў безліч паэтычных радкоў:

Ёсць рэчка такая,
Лучосай завецца,
Над рэчкаю сад наш і дом;
Там спелыя вішні
Ружовым суквеццем
Схіляюцца ўніз
Над вадой...

Размова ідзе пра Віцебск, дзе 6 студзеня 1914 года нарадзіўся Пятро Шырокаў. Рана застаўся без бацькі, выхаваннем сына займалася маці Настасся Карпаўна Паедава.

Пасля Віцебскай сямігодкі Пятрок Шырокаў паступае ў рамеснае вучылішча чыгуначнікаў. Яшчэ ў школе пачынае пісаць вершы, а ўжо ў вучылішчы цвёрда вырашае займацца літаратурай. У 1933 годзе паступае ў Мінскі педагагічны інстытут. Яго нарысы і вершы друкуюцца ў газетах „Віцебскі рабочы”, „Савецкая Беларусь” і „Піянер Беларусі”. У інстытуце ён знаёміцца і сябруе з Уладзімірам Клішэвічам, Масеем Сяднёвым, Якубам Ермаловічам, Міколам Гвstation Гваздовым і іншымі аўтарамі-пачаткоўцамі. Тут ён знаёміцца і з яўрэйкаю Басяй Цыпінай, якая была на сем гадоў старэйшая за яго. Цяжкія матэрыяльныя ўмовы вымушаюць Пятра Шырокава быць бліжэй да гэтай багатай мінчанкі-аднакурсніцы. Але, мабыць, гэта яна ўмела прывабіла беларускага рахманага хлопца. Пра гэта добра напісаў у сваім рамане „Раман Корзюк” (Нью-Ёрк-Мюнхен, 1985) Масей Сяднёў: „... Скончылася лекцыя Піятуховіча, і студэнты высыпалі на перапынак на калідор... Пятрок Шыракоў (у рамане М.Сяднёва напісана Шыракоў. – С.Ч.) з Цыпінай і з некаторымі іншымі студэнтамі заставаліся ў аўдыторыі, на калідор не выходзілі. Цыпіна карміла Шыракова бутэрбродамі, якія яна прыносіла з дому і якімі яна спадзявалася ўтрымаць пры сабе галоднага Шыракова. Шыракоў напачатку адмаўляўся ад пачастунку, але Бася ўмела яго ўгаварыць, і Пятрок згаджаўся, вымаў з кішэні сьцізорык і гаварыў:

– Ну, калі ты ўжо гэтак просіш, адрэжу ад цябе на капейку!


Год выданьня 2-гі.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць 3 разы у месяц

Пятніца, 10-га сакавіка 1944 г. № 7 (52)

Адрыс рэдакцыі: Віцебск, вул. Талстога, 8.

Прыклад сапраўднага сацыялізму

Газета, якую рэдагаваў Тодар Лебяда

Потым Пятрок пачаў адразаць і на рубель. Нарэшце, Пятрок сьцізорыка ўжо не вымаў, а браў Басіны бутэрброды цалкам... Гэтак вось і цяпер, зьеўшы бутэрброд, ён выцягнуў за руку з-за стала Басю і закружыўся з ёй у вальсе каля прафэсарскай кафэдры. Вальс ён граў сам сабе на губах. Трымаючы Басю шчыльна, але настолькі, каб можна было сваім корпусам адкінуцца назад, Пятрок кружыў Басю да шаламлівасьці, і яна, быццам у вялікай жарсьці, клала яму сваю галаву на плячо, заглядаючыся ў ягоныя вочы знарок спакусьліва і міргліва. Потым ініцыятыву забірала Цыпіна, пачынала знарок круціць Петрака налева, ведаючы, што ён умее танцаваць толькі ў адзін бок. Гэта называлася вальсам Цыпінай. Прысутныя сьмяяліся і білі ім у ладкі...".

У 1936 годзе, хоць шлюб і не быў зарэгістраваны, Бася Цыпіна нарадзіла ад Пятра Шырокава дачку Алесю, якую ў пасведчанні аб нараджэнні так і запісала: Шырокава Аляксандра Пятроўна, 1936 года нараджэння... Але ў гэты час бацьку Алесі і яшчэ адзінаццаць студэнтаў інстытута абвінавацілі ў „буржуазным нацыяналізме". Яны апынуліся аж у Новасібірскай вобласцы. Пятро Шырокаў быў асуджаны на пяць гадоў, Якуб Ермаловіч і Масей Сяднёў на шэсць гадоў і г.д. Шырокаву ўдалося ўладкавацца кавалём, а некаторых яго сяброў закінулі аж на Камчатку.

За сувязь з „ворагам народа" Басю Цыпіну на апошнім курсе выключылі з інстытута. Работу ў Мінску ёй не давалі, сачылі за кожным крокам. Але настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй не хапала, і таму яе літасціва накіравалі ў Смалявіцкую сярэднюю школу выкладаць беларускую мову і літаратуру. З ёю паехала і дачка.

У Смалявічах Басі Цыпінай жылося вельмі цяжка: бясконцыя праверкі то з раённага аддзела адукацыі, то з райкама партыі, то з КДБ. Але яна не здавалася, пісала ва ўсе інстанцыі з просьбаю, каб адбыўся над мужам паўторны суд. І ў 1940 годзе па хадайніцтве ўсё той жа Басі Цыпінай Пятра Шырокава і яго сяброў прывозяць у Мінск для „перагляду справы". З Мінска адпраўляюць у Чэрвень, дзе і асуджаных застае вайна.



Першы паэтычны зборнік Тодара Лебяды

Нямецкія самалёты ўжо бамбілі горад, таму савецкай уладзе было не да зняволеных. Так Тодар Лебяда са сваімі сябрамі апынуўся на волі. Гэты момант Масей Сяднёў занатаваў у сваёй паэме „Мая вайна" (зборнік „Патушаныя зоры", Нью-Ёрк – Мюнхен, 1975, с.203-205):

Я падаў і плакаў...
– Ты што? –
пачуўся мне голас ласкавы
і нехта падаў паліто: –
Накрыйся й ляжы!
Апрытомнеў
І вочы падняў я – на крок
У ранішніх сонца промнях
Стаяў ад мяне Пятрок.
Той самы Пятрок, зь якім мы
вучыліся тры гады.
А потым экзамен ў Нарыме
трымалі за курс бяды.
Прасоўваліся па балотах
армейцы ваўчынай гайнёй.
І лёталі самалёты
чужыя над нашай зямлёй.
Быў горад далёка за намі,
Ад сажы і дыму густы.
Ішлі з Петраком мы жытамі,
ня ведаючы куды.
І ўспомнілі мы, што болей
канвою над намі няма,
што сапраўды на волю
нас выпусьціла турма.
І хоць мы турму гнаілі,
ды посьля пяцёх гадоў
здавалася нам, наіўным,–
мы сталі студэнтамі зноў.
Шумлівыя, сьветлыя залі,
прыемны студэнтак напеў.
Мы лепш, чым другія, пазналі
„Кароткі курс ВКП".
Прайшлі мы і з словам „нацдэмы"
па мёрзлай зямлі і вадзе.
Ня ведалі нашыя, дзе мы
і думалі: можа, нідзе.
Ісьці не маглі мы болей,
супольна – рука ў руку:
мяне у вадным чакалі,
яго – у другім баку.
Заплакалі мы на ростань,
зморaныя ад хады,
і разьвіталіся проста,
як нашы калісьці дзяды.

У памяці дзень той выцьвіў,
на музыку просіцца слоў...
Мой сябра пайшоў на Віцебск,
а я – на Магілёў...

Пятро Шырокаў дабраўся да Віцебска, дзе жыла яго маці. Тут ён ізноў узяўся за пяро – пісаў вершы, апавяданні і драматычныя творы. Адначасова рэдагаваў газету „Беларускае слова", што выходзіла тры разы на месяц. У Віцебску была закончана і п'еса „Загубленае жыццё", якая ўпершыню была пастаўлена на сцэне Віцебскага драмтэатра. Дарэчы, у 1943 годзе беларускі рэжысёр Вячаслаў Селях-Качанскі ажыццявіў пастаноўку гэтай п'есы і на сцэне Мінскага гарадскога тэатра. Пазней, на эміграцыі ў Германіі, разам з кампазітарам Міколам Равенскім, ён арганізуе эстрадную групу „Жыве Беларусь" і зноў ажыццявіць пастаноўку „Загубленага жыцця". Вяртаўся да яе В.Селях-Качанскі і жывучы ў г.Элізабет (ЗША). У 1952 годзе ў Канадзе п'еса „Загубленае жыццё" выходзіць з друку асобным выданнем. І толькі ў 1995 годзе яна была апублікавана на радзіме ў часопісе „Тэатральная Беларусь". Гэтая драма – першая антыбальшавіцкая п'еса ў беларускай літаратуры, якая праўдзіва паказвае гады калектывізацыі і сталінскіх рэпрэсій на Беларусі.

У акупаваным немцамі Віцебску Пятро Шырокаў рэгіструе шлюб з артысткаю Верай Жгут. Ён падтрымлівае цесныя сувязі з беларускімі акцёрамі і пісьменнікамі, часта наведвае Мінск. А ў 1944 годзе з друку выходзіць першы паэтычны зборнік Тодара Лебяды „Песьні выгнаньня". Ва ўступе да яго напісана: „Беларускі народ многа перацярпеў гора і зьдзеку. Найбольш, аднак, прыйшлося цярпець за часоў бальшавіцкага панаваньня. Бальшавікі, накідаючы сваю волю беларускаму народу, жорстка перасьледавалі ўсіх тых беларусаў – сялян, работнікаў, інтэлігентаў, якія хацелі наладжваць жыцьцё ў Беларусі так, як хацеў беларускі народ. Бальшавікі саджалі беларускіх патрыётаў у вастрогі, канцэнтрацыйныя лягеры, высылалі ў далёкія азіяцкія краіны, адкуль большыня з іх ніколі ўжо ня вернецца, бо яны не змаглі перажыць бальшавіцкіх зьдзекаў і тых жудасных абставінаў, у якія іх укінулі бальшавікі, і злажылі сваё жыцьцё, як ахвяру, на аўтар Бацькаўшчыны. Ёсьць, аднак, і такія людзі, якім удалося перажыць бальшавіцкія зьдзекі, вырвацца з бальшавіцкіх кіпцюроў і зьявіцца ізноў на беларускую ніву да працы дзеля дабра беларускага народу. Да гэткіх шчасьліўцаў належыць між іншых малады беларускі паэт Тодар Лебяда. Яму ўдалося вырвацца з бальшавіцкіх рук, захаваць жыцьцё, і цяпер ён плённа працуе на беларускай культурнай ніве...Зборнік гэты мае вялікія мастацкія вартасьці і ёсьць дакумэнтам тых усіх жудасьцяў, якія мусілі перажыць беларусы ад бальшавікоў і да паўтарэньня якіх беларускі народ ніколі ня можа дапусьціцца":

Пад вакном за выцвілай,
За брамай
Расцвітаў ізноў прыгожы май.
Трэці год, як сына ўжо забралі,
Трэці год, як роднага няма.
Як забралі – весці не пачула...
І на твары роспач і адчай.
Трэці год, як бедная матуля
Перастала спаці па начах.
Поўнач. Стукнуў хтосьці.
Хто там?
Гэта сон... Але ж пасля сама
Выбягае хутка за вароты, –
Прыглядаецца... глядзіць вакол...
Няма.
Той жа ночы дзесьці на чужыне
Родны сын яе навек спачыў.
І дарма матуля варажыла,
Пад акном сядзела уначы.



Валянцін Таўлай, Сяргей Хмара, Тодар Лебяда, Масей Сяднёў, Алесь Салавей, Уладзімер Сядура, Хведар Ільляшэвіч, Аляксей Анішчык. Менск, 1944 г.

У 1944 годзе, падчас адступлення немцаў, Тодар Лебяда вырашыў уцячы на Захад. Ён добра ведаў і адчуваў, што яго зноў чакае турма, зноў чакаюць сталінскія рэпрэсіі. Таму спачатку быў Берлін, а пасля Прусія, дзе ён, разам з жонкаю Верай Жгут, уладкоўваецца на працу да аднаго баўэра. Як жылося і працавалася ім там, сведчыць адзін ліст Тодара Лебяды да Масея Сяднёва. У свой час гэты ліст Сяднёў прыслаў мне, ён захоўваецца ў маім хатнім архіве: „Здароў, Масей! Сёньня атрымалі ад цябе першы ліст і былі бясконца рады. Малайчына, што не застаўся ў Беластоку! Аб нас ты ўжо напэўна тое-сёе чуў.

Жывем з Валодзькам (*Клішэвічам – С.Ч.*) у аднаго баўэра, працуем у яго: косім, чысьцім гной і г.далей, за што маем ад яго кавалак хлеба. Калі казаць аб нашым жыцьці, дык пра ўсё можна выказаць адным словам – сытыя. Больш нічога. Ніякай духоўнай стравы. Рана ўстаем, ідзем на працу, прыходзім з працы – вячэраем і кладземся спаць, каб заўтра ісьці зноў на працу. Гэтаксама жыве і Віцьбіч. Ён толькі за чатыры вярсты ад нас. Пісалі мы некалькі лістоў у Бэрлін, але адказу не атрымалі, што яшчэ раз пацьвярджае думку аб нашых беларусах: калі сам сыты, дык аб галодных не спагадае. Я гэта адчуў яшчэ на Бацькаўшчыне, а цяпер гэта лішні раз толькі пацьвярджаецца. Мы – беларусы такімі адносінамі (панскімі) да людзей дабіліся таго, што нам ужо мала хто й верыць, аб чым бы мы ні казалі.

Вось мы сёньня радуемся з Валодзькам, што ты зараз у Бэрліне. Ты – не такі, як нашыя астатнія беларусы. Будзем спадзявацца, што ты дзе-небудзь, калі-небудзь і закінеш там за нас слова. Галоўнае – каб ты не забываўся пра нас і пісаў нам лісты, дасылаў газэты (як мага акуратней) і па магчымасьці іншую літаратуру, бо мы зараз анічога ня маем. Атрымалі адзін нумар „Раніцы" ад сп.Караленкі, за што вельмі шчыра яму ўдзячны.

Учора я пахаваў сваё дзіця. Пасьля ўсяго вельмі дрэнны настрой. Мы з Валодзькам разабралі наш ложак і зрабілі майму сыну маленькую дамавіну. Цьвікоў нацягалі са сьцен і з старых дошак.

Яшчэ раз просім цябе – пішы нам. Мы будзем пісаць як найчасьцей. Бывай здароў! Твае Пятрок і Валодзя Клішэвіч.

Калі ты ўведаеш аб нашых паэтах Л.Случаніну, Золаку, Алесю Салаўю, або ўведаеш, дзе зараз П.Манькоў, не забывай паведаміць. Устрой, Масей, для мяне, калі ласка, у „Раніцу" аб'яву: шукаю дачку Аляксандру Шырокаву – 8 год, і маці Настассю Паедаву, якія апошнія часы знаходзіліся ў мястэчку Лентварова Віленскай акругі. Паведаміць праз газэту „Раніца" – Тодару Лебядзе. Аб'яву гэтую перарабляй, як хочаш. Я падаў толькі сэнс. Тодар Лебяда".

Цяжка сказаць ці была гэтая аб'яўка ў „Раніцы", а вось невялікая рэцэнзія М.Сяднёва на зборнік „Песьні выгнаньня" была ў свой час надрукавана ў „Новай дарозе" (Беласток).

Пасля Прусіі сляды Пятра Шырокава на пэўны час губляюцца. Хадзілі чуткі, што ён, з'агітаваны савецкім афіцэрам, вярнуўся да Басі Цыпінай і да сваёй дачкі Алесі. Але гэтае вяртанне шчасця яму не прынесла. У маі 1947 года Ваенным Трыбуналам войск МУС Мінскай вобласці па арт.63-1 КК БССР Шырокаў Пётр Фёдаравіч зноў быў асуджаны, на гэты раз на 25 гадоў. Дарэчы, у 1994 годзе ў горадзе Чэрвені Мінскай вобласці я адшукаў дачку Тодара Лебяды Алу (Алесю) Пятроўну Козел. У адным з пісем яна пісала, што бацьку тады прыгаварылі ні на 25 гадоў, а да вышэйшай меры пакарання „за измену Родине". „І бацька два тыдні сядзеў у смяротнай камеры-адзіночцы і кожную хвіліну чакаў, што вось за ім прыйдуць. Але страху ўжо не было. Толькі б хутчэй. Ён разказваў пазней, што яму здавалася, быццам у камеру прыходзяць невядомыя і людзі блізкія, якія ўжо памерлі, і супакойвалі, суцяшалі. І тут раптам ноччу бразнулі запоры, і ў камеру зайшлі тры чалавекі, яны былі ўзброеныя. Загадалі ўстаць і зачыталі ўказ Сталіна аб замене „смерной казни" дваццацю пяццю гадамі зняволення. „Падкасіліся ногі, сеў, дзе стаяў. А ў галаве адна думка: буду жыць!" – так расказваў мне бацька ў 1956 годзе", – пісала мне ў адным з пісем Ала Козел.

У якіх раёнах Сібіры адбываў свой тэрмін беларускі пісьменнік Тодор Лебяда, пакуль невядома. Вядома толькі, што 30 жніўня 1956 года ён быў вызвалены з-пад варты, але ў Беларусь вяртацца яму не дазволілі, таму прыйшлося ўладкавацца цырульнікам у адным з пасялковых дамоў афіцэраў, а таксама працаваць на іншых работах. І толькі ў 1960 годзе ён прыязджае ў горад Слонім, уладкоўваецца працаваць рэзчыкам паперы на мясцовую кардонна-папяровую фабрыку „Альбярцін". А ў вольны ад працы час Тодар Лебяда па-ранейшаму піша вершы, апавяданні і п'есы. Сёе-тое друкуе ў слонімскай раённай газеце „Вольная праца". Але пра свой псеўданім Пятро Шырокаў нікому нічога не казаў, як і пра выдадзеную ім у 1944 годзе кнігу вершаў. Быў заўсёды маўклівы і даволі просты. Вельмі хацеў ства-



Тодар Лебяда з жонкай Басяй Цыпінай (Галінай Ільінічнай Шырокавай), 1959 г.



ЗАГУБЛЕНАЕ ЖЫЦЦЁ

Драма ў трох актах

Дзеючыя асобы:

Андрэй Прыдарожны — заможны селянін.
Агата — яго жонка.
Марыська — дачка Прыдарожных.

Часопіс „Тэатральная Беларусь” упершыню ў 1995 годзе апублікаваў п’есу Тодара Лебяды „Загубленае жыццё”

рыць на фабрыцы драматычны гурток, каб ставіць свае п’есы. Дарэчы, у Слоніме ён напісаў п’есу ў трох актах „У нас, на Гродзеншчыне”, прысвечаную вясковаму жыццю моладзі. У гэты час было напісана і некалькі аднаактовых п’есак. Адна з іх – „Людзі ва Хрысце” – была надрукавана ў „Вольнай працы”. Тодар Лебяда быў добры і апавядальнік. Асабліва яму ўдаваліся гумарыстычныя апавяданні і абразкі на маральна-этычныя тэмы.

Жывучы ў Слоніме, Пятрок Шырокаў пачынае шукаць і сваіх сяброў, найперш Уладзіміра Клішэвіча. Былы рэдактар беластоцкага беларускага тыднёвіка „Ніва” Георгій Валкавыцкі захаваў і перадаў мне пры жыцці пісьмо Пятра Шырокава ў „Ніву”, дзе ён, у прыватнасці, пісаў: „Паважаная рэдакцыя! Прагглядаючы архівы Вашай газеты за мінулыя гады, я знайшоў у ёй надрукаваныя вершы майго блізкага сябра па інстытуце Уладзіміра Клішэвіча, якога я лічыў загінуўшым у часы Другой Сусветнай вайны. Быў бы Вам вельмі ўдзячны, калі б Вы паведамілі мне аб яго цяперашнім месцажыхарстве, альбо даслалі яму мой хатні адрас: БССР, Гродзенская вобласць, г.Слонім, пас. Альбярцін, вул. 17 верасня, д.3. З нецярпеннем чакаю Вашага адказу. З пашанай – Шырокаў Пётр Фёдаравіч. 2.V.61 г.”.

Просьба яго была рэдакцыяй выканана. Уладзімір Клішэвіч і Тодар Лебяда знайшлі адзін аднаго. Яны перапісваліся, бо ў адным з пісьмаў да Клішэвіча Пятро нават хваліўся перад ім, што стаў ужо дзедам...

1 студзеня 1962 года Пятро Шырокаў звольніўся з работы і назаўсёды пакінуў Слонім. Ён прыехаў у горад Чэрвень Мінскай вобласці і ўладкаваўся на працу сакратаркай-машыністкай у рэдакцыю раённай газеты „Уперад”. Там піша вершы, фельетоны, гумарэскі. Друкуецца не толькі ў сваёй газеце, але дасылае творы і ў рэспубліканскія выданні. Праўда, падпісваецца ўжо другім псеўданімам – Клім Каліна.

У канцы 1962 года Тодар Лебяда пакідае Беларусь і ад’язджае на Разаншчыну ў Расію да знаёмай жанчыны. З ёю наш зямляк пражыў сем гадоў. Там ён пабудаваў дом, пасадзіў сад. Але гады сталінскіх рэпрэсій далі аб сабе знаць. Тодар Лебяда перанёс два інфаркты і напачатку 1970 года памёр. Яго пахавалі ў пасёлку Воршава Пуцяцінскага раёна Разанскай вобласці.

Да ўсяго сказанага пра двойчы рэпрэсіраванага беларускага пісьменніка Тодара Лебяду хочацца дадаць, што перачытваючы сёння пісьмы дачкі Тодара Лебяды Алы Козел, напісаныя ёю да аўтара гэтых радкоў у 1994 годзе, знайшоў такія радкі: „Бацька быў цікавы і шчыры чалавек, валодаў вялікімі гуманітарнымі ведамі, добра спяваў, у яго быў вельмі нізкі густы бас. Спяваў толькі беларускія песні „Ці ўсе лугі пакошаны”, „Ой, у полі вярба”, „Ой, пайду я лугам, лугам” і многія іншыя народныя песні. Быў вялікім патрыётам сваёй Бацькаўшчыны, любіў усё беларускае: і зямлю нашу, і людзей, і народныя звычаі...”.

А яшчэ Тодар Лебяда пісаў выдатны вершы, якія не страцілі сваёй актуальнасці і каштоўнасці сёння. Вось некаторыя радкі і строфы з яго вершаў:

***

Выйду зноў у ранняе прадвесне
Сустракаць цудоўную зару...
Для цябе сягоння мая песня,
Дарагая сэрцу Беларусь!..
На твае на бацькаўскія гоні,
На палёў нязведаную шыр
Песню гордую Крывіцкае «Пагоні»
Я нясу ад шчырае душы...

***

Мядовыя ліпы
У стройных прысадах,
І родны, знаёмы мне гай...
Ляці ж, мая думка,
Ляці, мая радасць,
На родны, далёкі курган!..

***

Мне лёсам вызначаны
Гэтакі прымус.
Аб шчасці сёння
Можна сніць і марыць
За тое,
Што я толькі - беларус -
Мне гэтакая кара!
Я кару іхнюю
З пагардаю прыняў,
Бо я - сын верны
Маці - Беларусі.
І я святога,
Гордага імя
Не адракуся!!!

***

Ой, пралягла
Чыгунка за Байкалам
Паміж узгор’яў
Роўна, бы абрус!
Цяпер на ёй
Амаль пад кожнай шпалай
Ляжыць замучаны
У выгнанні беларус...

Сяргей Чыгрын
Фотаздымкі і дакументы з архіва аўтара

O Władysławie Malinowskim – mińskim lekarzu Janki Kupały

Profesorowi Wiktorowi Łaszewiczowi i doktor Irenie Makac-Karpiuk dedykuję – Helena Głogowska

Z Bobrujska przez Mińsk, Słonim do Sulęcina

Długo zagadką pozostawał dla mnie miński lekarz Janki Kupały – Władysław Malinowski. To on w 1920 r. wspólnie z doktorem Stefanem Kozubowskim ratował życie klasykowi literatury białoruskiej w mińskim szpitalu. 20 marca 1920 r. Janka Kupała wysłał do redakcji gazety „Беларусь" list, w którym dziękował tym, którzy w czasie choroby okazali mu „братнюю помач і апеку". Poeta wymienił w nim osoby, które zasłużyły na wdzięczność „сваімі шчырымі адносінамі к майму няшчасьцю". „Першым чынам нізкі паклон і дзякуй ад сэрца шлю д-ру Казубоўскаму і д-ру Маліноўскаму; першаму – за аперацыю, дзякуючы якой я амаль не з таго сьвету ўскрос, а таксама другому за шчыра бацькоўскі дагляд і перавязкі, якімі стараўся аблягчыць мае цяжкія мучэньні" – pisał w nim poeta, wymieniając swoich najważniejszych opiekunów.

Doktor Władysław Malinowski jako jedyny z trzech mińskich lekarzy doczekał się „własnej" ulicy. W Sulęcinie. I to życzliwość współczesnych sulęczynian zainspirowała napisanie tego tekstu, a oni stali się jego współautorami.

W XX-wiecznej wędrówce ludów, ze wschodu na zachód, ciągle gubiły się gdzieś czyjeś ślady. Rzadko zostawała po nich pamięć i wdzięczność. A na taką niewątpliwie zasłużył doktor Władysław Malinowski, który z rodzinnego Bobrujska, przez Mińsk i Słonim, po II wojnie światowej dotarł na Ziemie Odzyskane w zachodniej Polsce i osiadł w Sulęcinie, mieście powiatowym w ówczesnym województwie zielonogórskim.

W Białorusi, w Bobrujsku czy w Mińsku, mało kto już pamięta tego wybitnego lekarza, czego dowodem jest brak przypisu przy jego nazwisku w zbiorze utworów Janki Kupały. Cóż, od czasu, gdy tam był po raz ostatni, minęło prawie sto lat. Jego bobrujscy i mińscy sąsiedzi i pacjenci dawno odeszli z tego świata. Trochę pamięci o doktorze Władysławie Malinowskim przetrwało jedynie w Słonimie, gdzie osiadł po I wojnie światowej. Tylko najstarsi wspominają go jdo dziś, ale nie wiedzą, co się z nim stało po II wojnie światowej.

Tymczasem w Sulęcinie, gdzie zmarł, znajduje się jego zadbany grób i ulica, nazwana jego imieniem. Choć nikt z mieszkańców nie wie, że ich szanowany lekarz w 1920 r. w Mińsku ratował życie klasyka literatury białoruskiej, Janki Kupały.

Ślady po doktorze Władysławie Malinowskim zachowały się w urzędowych spisach lekarzy i w rocznikach lekarskich. Jego biogram razem ze zdjęciem znalazł się w „Słowniku lekarzy polskich" Piotra Szarejki (s. 347-348). Wynika z niego, że przyszły lekarz urodził się 26 kwietnia 1871 r. w Bobrujsku w rodzinie Aleksandra Malinowskiego – adwokata i właściciela majątku Karmazy pod Bobrujskiem – oraz Zofii z domu Chodasiewicz. Ukończył gimnazjum w Mińsku i podjął studia przyrodnicze w Peters-



Ze zbiorów Siarhieja Czyhryna

Doktor Malinowski (siedzi pośrodku), obok siedzi doktor Efras, stoją felczer Stefanowicz (z prawej) i doktor Łojka (z lewej). Słonim, 1939 r.



Ze zbiorów Siarhieja Czyhryna

Na schodach stoją lekarze Malinowski, Efras i Łojka. Słonim, koniec lat 1930.

burgu. Stamtąd przeniósł się do Moskwy i zaczął studiować medycynę. Dyplom lekarza uzyskał 31 października 1898 r. w Moskwie. Przed I wojną światową pracował w szpitalach na Ukrainie, w Horodyszczu w powiecie nowogródzkim, w Nowogródku i w Mińsku, gdzie był lekarzem powiatowym. Po zajęciu Mińska przez wojska polskie latem 1919 r. pracował tam do 18 września 1920 r. jako chirurg w szpitalu wojskowym. Gdy szpital ewakuował się do Łodzi, został skierowany do wojskowego szpitala etapowego w Baranowiczach. Pracował tam do 29 kwietnia 1921 r. Następnie osiedlił się w Słonimie, gdzie do 1932 r. był lekarzem powiatowym, a następnie lekarzem miejskim. Słonimczanin, profesor Aleh Łojka, wspominając swego ojca felczera pisał: „слонімцам мой бацька стаў 10 лістапада 1929 года, калі яго пад сваё крыло ў Слонімскі Чырвоны Крыж узяў доктар Уладыслаў Маліноўскі. (...) Пры Слонімскім магістраце ён узначаліў Чырвоны Крыж – нешта накшталт паліклінікі, дзе кожны мясцовы чалавек бясплатна мог атрымаць медыцынскую дапамогу. Пры ўрачу павінен быў быць другі чалавек – фельчар. Вось такім другім чалавекам і стаў мой бацька. Маліноўскі стаў для майго бацькі тым, хто яго вывеў у сапраўдную медыцыну, у народныя лекары. (...) У 1931 годзе доктар Маліноўскі паслаў майго бацьку ў Варшаву на санітарныя курсы. Пасля курсаў бацька стаў санітарным кантралёрам усяго даваеннага Слоніма: ад вуліцы да вуліцы, ад падворка да падворка" (A. Лойка, „Дрэва жыцця. Кніга аднаго лёсу", Слонім 2004, s. 11).

Doktor Władysław Malinowski przez wiele lat był też prezesem Towarzystwa Przeciwgruźliczego. W 1939 r. mieszkał w Słonimiu przy ulicy Zamkowej 18.

Po wybuchu II wojny światowej pracował w słonimskim szpitalu miejskim, będąc już emerytem. Ciekawe, że lekarzem powiatowym był wówczas Jan Hieniusz, mąż białoruskiej poetki Łarysy Hieniusz. Jego zastępcą był Anton Łojka.

Doktor Władysław Malinowski pod koniec wojny przeżył tragedię rodzinną – w nocy z 3 na 4 lipca 1944 r. Niemcy rozstrzelali jego brata Antoniego (był urzędnikiem starostwa w Słonimie) wraz z żoną Marią i innymi 105 Polakami. Władysław Malinowski akurat wówczas pełnił dyżur w szpitalu.

W 1945 r. wyjechał do Sulęcina, gdzie do 1951 r. był dyrektorem szpitala powiatowego. Wtedy objął stanowisko lekarza rejonowego w przychodni PKP w Sulęcinie.

Zmarł 30 stycznia 1959 r. w Sulęcinie i został pochowany na miejscowym cmentarzu. Wcześniej, 28 marca 1950 r., zmarła jego żona Janina Kobodro (urodzona 2 maja 1872 r.), która miała z pierwszego małżeństwa trzy córki i syna.

Sulęcińskie ślady

O pobycie doktora Władysława Malinowskiego w Sulęcinie wiedziała rodzina doktora Stefana Kozubowskiego z Gdańska. Po wojnie poświadczał mu lekarskie kompetencje i taki dokument zachował się w zbiorach rodzinnych. Poszukiwania w Sulęcinie zaczęłam od biblioteki, w której zapytałam o pasjonatów historii miasta, gdyż tylko na pomoc takich osób mogłam liczyć prawie 55 lat po śmierci doktora Władysława Malinowskiego. Wskazano na Stefana Wienowolskiego i Macieja Bardena. Pierwszy przesłał zdjęcie domu, w którym mieszkał doktor Władysław Malinowski oraz artykuły z „Głosu Sulęcińskiego" – wspomnienie Jadwigi Cholewickiej o doktorze (1996, nr 7) oraz artykuł „Sulęcińska służba zdrowia". W poszukiwanie sulęcińskich śladów doktora Władysława Malinowskiego zaangażował się też Maciej Barden – miejscowy bard i krajoznawca. Znalazł nawet inicjatora nadania imienia ulicy. Był nim lekarz ginekolog Marek Zaręba. W poszukiwaniach śladów doktora Władysława Malinowskiego w Sulęcinie tropem archiwalnym pomagała Teresa Kuciak z Archiwum Państwowego w Gorzowie Wielkopolskim.

Mimo usilnych poszukiwań długo nie udawało mi się ustalić, kiedy i w jakich okolicznościach doktor Władysław Malinowski przybył do Sulęcina. Wyjaśnili to słonimianie zamieszkali po wojnie w Polsce – Teresa Zwierko i Rudolf Sobolewski. Otóż skierowano tam „repatriancki" transport ze Słonima. Niektórzy wysiedli z niego wcześniej, inni, wśród nich i doktor Władysław Malinowski, tam właśnie dotarli. Z dokumentów archiwalnych wynika, że 8 sierpnia 1945 r. doktor Malinowski został zameldowany w Sulęcinie przy ulicy Bolesława Chrobrego 3. Później mieszkał przy Ceglanej

12. Z zachowanej w archiwum księgi meldunkowej wynika, że przybył sam, bez rodziny. Podawał wtedy, że urodził się 9 maja 1875 r. w Bobrujsku na Białorusi. Na pomniku nagrobnym podane jest 26 kwietnia 1871 r. Datę dzienną można przyjąć jako bliską prawdy. Przeliczając stary styl na nowy otrzymamy 8 maja, jako że w XIX wieku różnica między stylami wynosiła 12 dni. Ale jakie powody miał doktor Władysław Malinowski, by „odmładzać" się o cztery lata? Wszak w 1945 r. i tak miał już 74 lata! „Odmładzając" się miał 70! To również wiek emerytalny, tym bardziej, że emerytem był już przed wojną. Tym niemniej, jak wynika z dokumentów, 1 września 1945 r. został kierownikiem szpitala, a później jego dyrektorem. W aktach z 1946 r. wymieniany był jako lekarz powiatowy. Pod koniec 1946 r. utracił te funkcje, a od 1947 r. lekarzem powiatowym został doktor Stanisław Komornicki, który także przyjechał do Sulęcina ze Słonima. Obaj znali się z praktyki lekarskiej w tym mieście w okresie międzywojennym.



Fot. Maciej Barden

Ulica doktora Władysława Malinowskiego

Ulicy w Sulęcinie imię doktora Władysława Malinowskiego nadano 26 kwietnia 1996 r. – akurat w 125. rocznicę jego urodzin. W załączniku do uchwały Rady Miejskiej w uzasadnieniu stwierdzano: „Władysław Malinowski od 01.09.1945 r. organizator i założyciel służby zdrowia w Sulęcinie. Pierwszy Dyrektor Szpitala Miejskiego, lekarz, który wpisał się w pamięć jako człowiek, którego celem nadrzędnym w życiu było dobro pacjenta".

Ciekawe, że w tym samym dniu, także na wniosek doktora Marka Zaręby, ulicę obok nazwano imieniem Dikusa Ekkela, który od 1988 r. organizował pomoc humanitarną dla mieszkańców Sulęcina, pomagał tamtejszym szkołom, a od 1992 r. Szpitalowi Miejskiemu – zebrał i przekazał na rzecz Fundacji Nowoczesny Szpital ponad 18 tys. guldenów.

Po nadaniu ulicy imienia Władysława Malinowskiego jego postać ożyła we wspomnieniach mieszkańców, zwłaszcza jego byłych współpracowników. Tak wspomniała go była pielęgniarka Jadwiga Cholewicka na łamach „Głosu Sulęcińskiego" (nr 7, s. 17) we wrześniu 1996 r.:

„Z okazji nadania jednej z nowych ulic naszego miasta imienia Władysława Malinowskiego pragnę jako jedna z niewielu już żyjących osób, które znały Doktora osobiście i miały zaszczyt pracowania niegdyś pod jego zwierzchnictwem, w tych krótkich wspomnieniach przybliżyć jego sylwetkę młodszej części naszej społeczności, jak również krótko nakreślić, czym się ten Człowiek przez duże „C" zasłużył dla Sulęcina.

Dr Malinowski przyjechał tu w ramach tzw. „repatriacji" z dalekiego Słonimia w woj. nowogródzkim, gdzie był ordynatorem oddziału chirurgicznego. Przed samą wojną, będąc już na emeryturze, pracował społecznie w Kasie Chorych, lecząc bezinteresownie ubogich pacjentów. W czasie wojny, gdy wymagały tego okoliczności, powrócił do pracy w szpitalu, w którym z narażeniem życia przechował kilku Żydów, ratując ich od zagłady. Wiem, że ci ocaleni ludzie pisali potem do Niego z Izraela, proponując Mu rozmaite formy spłacenia długu wdzięczności, m.in. kupno samochodu. Z oburzeniem odrzucił ich ofertę, mówiąc że życie ludzkie nie ma ceny i że nie robił tego dla pieniędzy.

Po raz pierwszy zetknęłam się z Doktorem 1 września 1945 r. przy okazji otworzenia szpitala. Był wówczas siwowłosym, starszym panem z również siwą bródką. W obejściu dość szorstki, nie bawił się w konwenanse i do wszystkich młodszych od siebie zwracał się per „ty", co z początku niejednego szokowało. Przy bliższym poznaniu okazało się, że pod tą szorstką powłoką ukrywało się wielkie, szlachetne, wrażliwe na ludzką krzywdę, serce.

W roku 1945, po zdobyciu Sulęcina, żołnierze sowieccy w bestialski sposób zniszczyli wszystkie znaczniejsze budynki, jak np. kościół, zabytkowy ratusz i m.in. szpital. To, co wówczas szumnie nazywaliśmy szpitalem, mieściło się w budynku poniemieckiej Szkoły Rolniczej (obecnie siedziba „Komunalnika"). Załogę tego szpitala stanowił personel niemiecki. I 1 września tegoż roku nastąpiło oficjalne przejęcie go przez władze polskie, a dr Malinowski chcąc nie chcąc musiał zostać jego dyrektorem, gdyż po prostu nie było innych lekarzy. Wprawdzie również ze Słonimia przyjechał jeszcze jeden lekarz, dr Stanisław Komornicki, pełniący przed wojną funkcję lekarza powiatowego – nie mający doświadczenia w pracy szpitalnej. Zajął się więc organizacją lecznictwa otwartego, kierując Ośrodkiem Zdrowia i Stacją Sanitarno-Epidemiologiczną.

Na barki dr. Malinowskiego spadły b. ciężkie obowiązki. Warunki, jakie zastaliśmy w tym pożal się Boże szpitalu, były wręcz okropne. Brak wszystkiego – odpowiednich łóżek, pościeli, nawet ciepłej wody, nie wspominając już o sprzęcie medycznym, lekach czy środkach dezynfekcyjnych. W kraciastych betach leżeli pacjenci, przeważnie jeńcy niemieccy, brudni, obrośnięci i zawszeni. Jednym słowem trzeba było zaczynać od zera.

Przy pomocy władz miasta i wojska zaczęto zwozić sprzęt medyczny i łóżka skąd się dało, m.in. ze szpitala więziennego w Słońsku. I powoli nasz

szpitalik nabierał przyzwoitego wyglądu. A pacjentów wciąż przybywało, ciągle brakowało miejsc. Nie było transportu sanitarnego, przyjmowano więc wszystkie przypadki, od położniczo-ginekologicznych począwszy na zakaźnych skończywszy. Były częste zachowania na dur plamisty i brzuszny, czerwonkę, malarię, błonicę itp. Przywożono chorych w ostatnim, rozpadowym stadium gruźlicy. Było również dużo wypadków z powodu pozostawionych po działaniach wojennych ruin, niewypałów. Doktor więc dwoił się i troił. łatając poszarpane pociskami ciała. Kończył amputację pourywanych kończyn, składał bez pomocy rentgena pogruchotane kości. Nie miał asysty, nawet personelu średniego było mało. Na 50 łóżek z dostawkami były dwie starsze, doświadczone pielęgniarki i dwie młodsze, które w tych ekstremalnych warunkach szybko nabierały rutyny. Była również jedna fachowa i bardzo dzielna położna, która właściwie mieszkała w szpitalu – p. Zofia Pieciukonis.

Doktor mieszkał obok, ale spędzając większą część doby w szpitalu i śpiesząc na każde wezwanie, praktycznie biorąc pełnił stały dyżur.

W rzadkich wolnych chwilach udzielał także porad pacjentom spoza szpitala, którzy zwracali się do niego o pomoc. Oczywiście zupełnie bezinteresownie. Na tym tle doszło kiedyś do sytuacji, która nas wszystkich rozśmieszyła. Otóż dwie kobiety, które chciały zapłacić doktorowi za udzieloną poradę, a którym On dość ostro poradził, aby za te pieniądze kupiły dzieciom mleka, dogoniły mnie na korytarzu, pytając: „Dlaczego Doktor nie bierze pieniędzy, może On się na niczym nie zna?".

Dla podległego personelu Doktor był jak ojciec, chociaż jak ktoś zasłużył, zbesztać też potrafił. Nie było nas wiele, toteż wiedział o nas wszystko, znał warunki, w jakich żyliśmy, a w razie choroby sam bez wezwania odwiedzał delikwenta w domu, spiesząc z pomocą.

Żarliwy patriota, dramatycznie przeżywał sytuację, w jakiej znalazła się nasza Ojczyzna po wojnie. Szczerze nie znosił komunistów i bardzo pragnął doczekać chwili, kiedy Polska będzie naprawdę wolna. Niestety, nie doczekał…

Nie znosił wszelkiego rodzaju zarozumialstwa, bufonady, na które to dolegliwości chorowali niektórzy przedstawiciele władzy ludowej, często ludzie z tzw. „awansu społecznego". Byłam świadkiem, jak do pasji doprowadziła Go kiedyś propozycja jednej z pań z Komitetu PZPR, aby wstąpił do partii.

Przez okres kilku miesięcy pomagał Doktorowi w Jego trudnej i wyczerpującej pracy dojeżdżający ze Słońska dr Siedler (Niemiec), pracujący niegdyś jako lekarz więzienny w tamtejszym więzieniu dla obcokrajowców. Dr Siedler był bardzo gorliwy w pracy, dostarczył nam dużo niezbędnego sprzętu medycznego i sporej ilości leków. Nie mógł się nadziwić fachowości Doktora w leczeniu przypadków chirurgicznych, a także i temu, że można było przy pomocy stawiania baniek wyleczyć zapalenie płuc. Późnym latem 1946 r. dr Siedler został rozpoznany przez grupę byłych więźniów jako ten, który pomagał słabym, niewydolnym więźniom przenieść się na „łono Abrahama". Aresztowany przez funkcjonariuszy UB w drodze do Sulęcina popełnił samobójstwo, zażywając cyjanek.

I znów Doktor Malinowski musiał sam podołać wszystkim trudom, jakże ciężkim, biorąc pod uwagę Jego podeszły wiek.

Dopiero wiosną 1947 r., gdy do Sulęcina przyjechał dr Mirosław Dudek, młody wówczas, bo ok. 40-letni człowiek, dla dr. Malinowskiego nastały lepsze czasy. Kierowanie szpitalem, leczenie chorób wewnętrznych, dziecięcych, położniczo-ginekologicznych spadło na dr. Dudka, a chirurgia i choroby zakaźne pozostały w gestii dr. Malinowskiego.

Życie w tym czasie zaczynało się już normować, wygasały ogniska chorób zakaźnych, mniej było wypadków z powodu wybuchów min i niewypałów, mieliśmy już nawet jedną karetkę pogotowia – no prawie jedną – UNRRA zaopatrywała już w leki, bieliznę, sprzęt medyczny, no i żywność, której w szpitalu bardzo brakowało. Zaczęto już planować odbudowę szpitala, w co zaangażowało się całe społeczeństwo naszego miasta. Inicjatorem tej akcji był dr Mirosław Dudek.

Dr Malinowski, póki było to niezbędne, pracował w oddziale chirurgicznym, przyjmował również dwie godziny w Przychodni Kolejowej. Do ostatnich dni czynny, żywo interesował się pracami przy odbudowie szpi-



Fot. Maciej Barden

Mogiła na cmentarzu w Sulęcinie

tala i jego wyposażeniem. Nigdy nie odmówił pomocy chorym, którzy się do niego zwracali, a byli to przeważnie najbiedniejsi.

Winniśmy Mu wdzięczność za tak wielki trud, jaki włożył w ratowanie życia ludzkiego w tych pierwszych, ciężkich powojennych latach, nie szczędząc swoich nadwątlonych wiekiem sił i zdrowia".

Z okazji 750-lecia Sulęcina na początku lat 90. wspomniano też o służbie zdrowia w powojennym mieście i jej pierwszych pracownikach, wśród których wyróżniał się doktor Władysław Malinowski jako pierwszy dyrektor szpitala. Było w nim 40 łóżek. Do pracy zgłosili się pierwsi pracownicy – położna Zofia Pieciukonis, pielęgniarki: Jadwiga Cholewicka, Helena Jankowska, Halina Lubowa, Maria Żyrowicka oraz salowe: Anna Mężyńska, Marta Skowrońska, Helena Śliwińska, Zofia Moderowa, Maria Juszkiewicz, Leokadia Sienkiewicz, Stefania Gejgał, Anna Awiżeń, Klara Krujszo, intendent Karol Nieradzik i jedyny pracownik administracyjny – Antoni Wolf. Pierwszym portierem i stróżem był Wincenty Sienkiewicz. W kuchni szpitalnej pracowały Aleksandra Krasowska, Janina Szczuka, Maria Kubasik, Maria Jacewicz oraz panie Bohaterowicz i Nowacka. W pralni zatrudniona została Apolonia Smolarek.

W artykule o sulęcińskiej służbie zdrowia „Niemal z niczego" („Służba Zdrowia", nr 30, z 22.07.1984 r.) przedstawiono jej powojenną historię, wspominając o zasługach w niej doktora Władysława Malinowskiego, który ściągnął z Warszawy do Sulęcina doktora Mirosława Dudka: „W tęczowych barwach opisywał sulęcińską rzeczywistość (wspaniały szpital, mieszkanie z umeblowaniem, wolna posada położnika, rzeka, jeziora…itd.). (…) Doktor Malinowski wiedział co czyni, gdy chytrymi wybiegami doprowadził do podpisania przez nowo przybyłego kolegę umowy o pracę jeszcze przed pokazaniem mu szpitala. O ile bowiem prezentowane w korespondencji dane dotyczące rzeki i jeziora, a nawet mieszkania okazały się ścisłe, o tyle trzeba było bujnej doprawdy wyobraźni, żeby nazywać pięknym rozpadający się, zaszczurzony budynek byłej szkoły, bez światła, wody i magazynów. Dopiero wówczas wyjaśniło się, że dwóch poprzedników doktora Dudka wyjechało natychmiast po obejrzeniu opisanego powyżej obiektu, zaś sam dr Malinowski właśnie zrezygnował z dyrektury sulęcińskiej placówki".

Doktor Władysław Malinowski spoczął na zawsze w dalekiej od rodzinnej Białorusi ziemi i tam zasłużył na pamięć potomnych. Szkoda, że w muzeum klasyka literatury białoruskiej Janki Kupały i nigdzie na Białorusi nikt już nie pamięta o tak wybitnym lekarzu. Niech artykuł ten będzie przypomnieniem i uszanowaniem tej postaci w 55. rocznicę jego śmierci.

Helena Głogowska

PS. Dziękuję za bezinteresowną pomoc i wsparcie Siarhiejowi Czyhrynowi ze Słonima, Maciejowi Bardenowi i Stefanowi Wienowolskiemu z Sulęcina oraz Teresie Kuciak z Gorzowa Wielkopolskiego. Bez nich nie byłoby tego tekstu i jego bogatej dokumentacji.

Успаміны з 1988 г.

1. Новы год я святкаваў яшчэ ў Бакара. Вечарам быў я ў савецкім клубе разам з іншымі польскімі працаўнікамі на канцэрце індускіх артыстаў, а пасля на танцах.

У сувязі з тым, што білет на самалёт з Дэлі ў Варшаву мне „Мегадэкс" выкупіў на 4 студзеня, а група 5 польскіх працаўнікоў ехала на экскурсію ў Варанасі, я далучыўся да іх як шосты і паехалі мы ранкам 2 студзеня ў Варанасі і на вечар былі там у гасцініцы. 3 студзеня я яшчэ раз плаваў лодкай па рацэ Ганг і аглядзеў індускія храмы. Аб рацэ Ганг я напісаў пасля наступны верш:

Плыву на доўгай лодцы па шырокім Гангу,
За мною сонца шар падняўся над зямлёй,
І горад прада мной пад колер сочнай мангі
Расцягнуты блішчыць усходняю красой.
Ступенькамі зыходзяць сотні белых готаў
У шэрую ваду з натоўпамі людзей.
Каплічкі над ракой бліскаюць пазалотай –
Здаецца, і яны купаюцца ў вадзе.
Я бачу прад сабой малы храм бога Шывы
Падмыты ўвесь вадой, схіліўся ўжо набок.
Пусты цяпер стаіць, як купал над абрывам,
І нават грозны бог з яго зусім уцёк.
Ён мае другі храм. святыню залатую,
У горадзе яна стаіць паміж дамоў,
Між залатых аздоб ён горда трыумфуе,
Глядзінь на пілігрымаў летам і зімой.
Далей храм Ганумана ўзняўся над ракою,
І ўнізе ўсіх нас вабіць сарамі жанчын,
Іх колеры вясёлкай ззяюць над вадою,
Кішаць, што мошак рой у сетках павуцін.
Вось гот багаты джайнаў у абдымках хвалі,
Дзе голыя мужчыны бавяцца гурбой,
А готы магараджаў. Калі і Шываля,
Пустыя, як сіроты, хмурацца імглой.
Далей над готам бачым дымавыя слупы,
Там свецяць іскраў рой і кветкі-аганькі.
Дымы плывуць з кастроў, дзе спальваюцца трупы,
І попел іх кідаюць у ахоп ракі.
Бо той, хто тут памрэ, здабудзе стан нірваны,

Не будзе нараджацца больш яго душа,
Яна не будзе мецць ні прагі, ні жаданняў,
Ніхто яе не будзе да жыцця змушаць.
Таму індусы часта тут чакаюць смерці,
Таму кідаюць дзеці тут сваіх бацькоў,
І сотні пілігрымаў хочуць тут памерці,
Купляючы кастры пры готах над ракой.

Пасля вечарам я цягнікам з Варанасі спальным вагогам паехаў у Дэлі.

4 студзеня дзень правёў я у гасцініцы „Імка" і ў горадзе, купляючы сувеніры для сям'і, а вечарам самалётам цераз Дубай я паляцеў у Варшаву.

У Варшаве на аэрадроме 5 студзеня сустрэлі мяне жонка з сынам і праваслаўныя Каляды я святкаваў ужо дома з сям'ёй. Прыехала з Беластока дачка з унукамі і зяць. Быў я таксама ў „Энергапраекце", дзе кіраўнік праектнай групы выказаў сваё шкадаванне, што я не вярнуўся на працу, бо хацеў на маё месца выслаць маладога праекціроўшчыка, аднак супакоіўся, калі даведаўся, што кіраўнік «Мегадэксу» ў Бакара не згадзіўся мяне замяніць на іншую асобу ў „Энергапраекце".

1 студзеня ў Польшчы мясцовасці Брусы, Юзэфуў, Ноўгарад-Бабжанскі і Ажараў атрымалі гарадскія правы, перасталі заглушаць радыёстанцыю Свабодная Еўропа і ў Нысе распачалі прадукцыю аўтамашыны ФСО Паланез Трак.

Я раней з Бакара выслаў запрашэнне прыехаць да мяне ў Бакара майму зяцю, мужу маёй дачкі, Валянціну Пацэвічу. Ён ужо аформіў пашпарт і візу і мы разам 16 студзеня выляцелі самалётам з Варшавы ў Дэлі. Ранкам затрымаліся на аэрадроме ў Дубаі і выйшлі цераз рукаў самалёта на дзве гадзіны да бязмытных магазінаў на аэрадроме, да якіх трэба было ехаць метраў сто стужкавым канвеерам. Зяць хацеў вельмі купіць у Дубаі ў магазінах электронны магнітафон, каб яго пасля прадаць індусам у Бакара. Аднак я пабаяўся індускіх мытнікаў у Дэлі, якія ўжо раней прычапіліся да дзвюх бутэлек каньяку ў маёй дачкі на аэрадроме ў Дэлі, калі яна раней прыляцела да мяне, і не згадзіўся. А аказалася пасля, што на аэрадроме ў Дэлі для нас не было індускіх мытнікаў і мы выйшлі ў Дэлі з аэрадрома без мытнага кантролю.

17 студзеня на дзень затрымаліся мы ў гасцініцы „Імка" ў Дэлі, дзе выкупіў я зяцю зкскурсію турыстычным аўтобусам па Дэлі, а пасля я паехаў з ім у Чырвоны Форт і ў іншыя месцы ў Дэлі. Вечарам селі мы ў цягнік Дэлі Дханбад і 18 студзеня былі ўжо ў Бакара. Там я выкупіў абеды сыну і сабе да канца студзеня ў нашай сталовай.

18 студзеня ў катастрофе самалёта ІЛ-18Д у кітайскім горадзе Чанггінг згінула 108 асоб.

19 студзеня было індускае дзяржаўнае свята і мы разам з іншымі польскімі і індускімі працаўнікамі на стадыёне ў Бакара аглядзелі выступленні розных індускіх ансамбляў, а пасля парад індускіх салдат.

20 студзеня я завёз і паказаў зяцю нашую электрастанцыю, а пасля працы пасёлкі Бакара, а 21 студзеня прайшлі мы па канатным мосце цераз раку і ён пабачыў месца, дзе мясцовыя ігдусы дабываюць лапатамі чорны вугаль з зямлі. Пасля індускі шафёр завёз мяне і майго зяця ў горад Час і ў храм сікхаў, аб якім я пісаў ва ўспамінах з 1986 г.

Пасля, калі я ездзіў рана да працы, зяць ішоў на дах нашага дома і там загараў на сонцы, ці ішоў у савецкі клуб і аглядаў маскоўскае тэлебачанне. Пасля вечарам мы хадзілі да сям'і савецкіх спецыялістаў з-за Урала, якія працавалі ў Бакара і з імі праводзілі вечары. У суботу кіраўнік даў нам на цэлы дзень шафёра і машыну і аглядзелі мы індускія храмы ў Раджырапе, а ў нядзелю храмы джайнаў у Парашнаце, аб якіх я пісаў ва ўспамінах з 1986 г.

2 лютага я завёз зяця Валянціна ў Дханбад, выкупіў яму білет на цягнік у Дэлі і ён разам з іншымі польскімі працаўнікамі, якія вярталіся ў Польшчу з Бакара даехаў на вакзал у Дэлі і да гасцініцы „Імка", а пасля самалётам вярнуўся ў Варшаву і Беласток.

4 лютага ў СССР рэабілітавалі М. Бухарына і іншых асуджаных ў сакавіку 1938 г. пры І. Сталіне на смерць. Не рэабілітавалі толькі Генрыха Ягаду, наркома ўнутраных спраў і генеральнага сакратара дзяржаўнай бяспекі, якога таксама І. Сталін ліквідаваў.

10 лютага ў час парламенцкіх выбараў у Бангладэшу згінула больш як 100 асоб.

11 лютага кіраўнік дазволіў мне і двум працаўнікам з Бакара паехаць на 4 дні у Калькуту, дзе я хацеў аформіць у польскім пасольстве запрашэнне прыехаць да мяне ў Індыю маёй жонцы Ніне. Паехалі мы таксі ў Дханбад, а адтуль цягпіком у Калькуту. У Калькуце выкупілі мы твохасабовы пакой з кандыцыянерам недалёка Бенгальскага заліва. Я ў Бакара непатрэбна купіў кілаграм каўбасы, якая за час нашага падарожжа ў Калькуту сапсавалася і мусіў яе ў Калькуце выкінуць.

Калькута гэта важны порт над Бенгальскім залівам і па велічыне была чацвёртым горадам у Індыі, жыло ў ім 15 мільёнаў жыхароў. З'яўляецца Калькута сталіцай штата Бенгаль. Я ў Калькуце быў ужо ў 1986 г., калі прыляцеў з Масквы ў Індыю. Цяпер пабачыў, што горад вельмі змяніўся. У 1986 г. я бачыў рыкшы, якія цягнулі людзі. У 1988 годзе зусім не было рыкшаў, а толькі таксі.

Калькуту пачалі будаваць ангельцы яшчэ ў 1690 г. Яны збудавалі ў Калькуце Форт Вільямс, куды тады нас індусы не ўпусцілі. Калькута да 1912 г. была ангельскай каланіяльнай сталіцай Індыі . У 1912 г. перанеслі сталіцу Індыі ў Дэлі. Вельмі прыгожым астаўся па ангельцах Мемарыял ангельскай каралевы Вікторыі, які тады быў музеем. Цікавым быў таксама мост Вікторыі.

Аглядзелі мы прыгожы кафедральны сабор св. Паўла пабудаваны ў 1847 г. і храм джайнаў і нейкія індускія храмы і паркі. Тады ў Калькуце працавала матка Тэрэза, ды нас яна не цікавіла, бо мы мелі мала часу.

Я паехаў на таксі ў Польскае Пасольства і аформіў запрашэнне ў Індыю для маёй жонкі, ды яна з яго не скарыстала, бо пабаялася сама ляцець самалётам з Варшавы ў Дэлі. Мы пасля выкупілі білеты на турыстычны карабель і некалькі гадзін паплавалі на ім па Бенгальскім заліве. І ў нядзелю 14 лютага вечарам вярнуліся ў Бакара.

12 лютага пусцілі ў эксплуатацыю ў СССР 723- кіламетровую высакавольтную энергалінію парадачы ЛЭП Скавародзіна (Амурсквя вобласць – Магоча – Халбон Чытынская вобласць).

З 13 па 28 лютага ў Кангары (Канада) прайшла XV Зімовая Алімпіяда. СССР атрымаў 11 залатых, 9 срэбных і 9-бронзавых медалёў, ГДР атрымаў 9 залатых, 10 срэбных і 6 бронзавых медалёў і Швейцарыя атрымала 5 залатых, 5 срэбных і 5 бронзавых медалёў.

17 лютага ў Намімбіі ад выбуху бомбы ля першага нацыянальага банка згінула 27 асоб і 70 асоб было параненых.

20 лютага Абласная Рада Нагорнага Карабаха прагаласавала аб пераходзе з Азербайджанскай ССР у Армянскую ССР.

28 лютага ў азерскім горадзе Сумгаіт азеры выступілі супраць армянаў. Згінула 41 асоба, а было параненых больш за 2 тысячы асоб.

З 1 сакавіка ліквідавалі ў Польшчы картачкі на шакалад і шакаладныя вырабы.

4 сакавіка в катастрофе самалёта ФГ-227 ля французскага горада Фонтанебло згінула 23 асобы

6 сакавіка паляцела ў космас камерцыйная ракета Арыян 3.

8 сакавіка сям'я Авечкіных з СССР (матка Нінель і 11 яе дзяцей), якая ляцела самалётам ТУ-154 з Іркуцка на гастролі ў Ленінград, захапіла самалёт і хацела паляцець на захад. Удалося ім пранесці ў самалёт абрэзы зброі. Пілот аднак прызямліў самалёт на ваенным аэрадроме і ён быў узяты штурмам антытэрарыстамі. Згінула матка сям'і Авечкіных Нінэль і яе 4 сыны, бортправадніца самалёта і 3 пасажыраў. 19 асоб было параненых. Апошніх членаў сям'і арыштавалі і судзілі.

8 сакавіка у Форт-Кэмпбел, Кентакі, ЗША сутыкнуліся два верталёты UH-60. Згінула 17 асоб.

11 сакавіка СССР выпусціў у космас адной ракетай 8 спадаражнікаў Зямлі: „Космас-1924", „Космас-1925", „Космас-1926", „Космас-1927", „Космас-1928". „Космас-1929", „Космас – 1930", і „Космас -1931".

13 сакавіка ў Японіі адкрылі тунель паміж астравамі Хансю і Хакаіда.

14 сакавіка ля спорных астравоў Спартлы на Паўднёвакітайскім Моры была марская бітва ў якой згінула 6 кітайскіх матросаў і 64 в'етнамскіх.

16 сакавіка ў Халабджы ў Іракскім Курдыстане іракскае войска выкарыстала хімічную зброю супраць мірнага насельніцтва. Згінула 5тыс., а пацярпела 20 тыс. жыхароў.

17 сакавіка ў катастрофе калумбійскага Боінга-727, які ўрэзаўся ў склон гары ля граніцы з Венесуэлай, згінула 143 асобы.

17 сакавіка войска Народнага Фронта Вызвалення Эрытрэі разбіла эфіопскі корпус і заняла Афабет.

24 сакавіка суд Ізраіля прысудзіў на 18 гадоў зневалення нуклеарнага тэхніка Мардэхая Вануну за раскрыццё ангельскім газетам ізраільскай атамнай праграмы.

1 красавіка кіраўнік польскай групы ў Бакара арганізаваў на цэлы тыдзень для ўсіх польскіх працаўнікоў нашым аўтобусам, які давозіў нас на працу, экскурсію ў гарады, якія ляжаць на поўначы штата Біхар. Паехалі мы ў бок сталіцы Патны.

Першым горадам была Бодхгая. У Бодхгаі ў гасцініцы выкупілі мы пакоі з кандыцыянерамі на двое сутак, перанеслі нашы рэчы з аўтобуса ў пакоі, з'елі ў гасцініцы абед і пайшлі аглядаць горад.

Бодхгая з'яўляецца невялікім ды слаўным індускім горадам, які ляжыць у 113 км. ад Патны. Горад – гэта святое месца для будыстаў усяго свету, бо ў ім князь Сідхартха Гаутама, калі меў 29 гадоў (500 год да н.э.), пад дрэвам „Бо", раздумваючы знайшоў Прасвятленне – новую рэлігію, якую з таго часу стаў прапаведваць. Паўстаў тут храмавы комплекс, у які едуць будысцкія пілігрымы з усяго свету.

Галоўным будысцкім храмам з'яўляецца Махабодхі з алмазным тронам Буды (Ваджрасана). Храм вышынёй 50 м, пабудаваны быў у III стагоддзі да н.э. царом Ашокам (273-232 да н.э.), адноўлены ў XI ст., а потым у 1882 г. без змянення вонкавага і ўнутранага выгляду і побач з дрэвам, якое вырасла з насення дрэва Шры Маха Бодхі з Шры-Ланкі, якое раней вырасла з насення арыгінальнага дрэва Махабодхі, пад якім Буда знайшоў Прасвятленне. Увесь комплекс храма Махабодхі мае многа памятных рэчаў па Будзе і яго прыхільніках.

Навокал храма Махабодхі згрупаваліся манастыры розных краін. Тут пабудавалі свае храмы Бутан, Кітай, Японія, М'янма, Непал, Сікім, Шры-Ланка, Тайланд, Тыбет і В'етнам. Кожны храм выкананы ў стылі адпаведняй дзяржавы са статуямі Буды.

Навокал раскінуты прыгожыя паркі. У кожных храмах праводзяцца рэгулярныя выступленні будысцкіх настаўнікаў, семінарыі і канферэнцыі і чуць было, як будысцкія манахі выбівалі на барабанах малітвенныя рытмы., а пілігрымы–будысты недалёка ад іх святога дрэва вешалі на сцяне храма каляровыя палотны з надпісамі, якія ўсхвальвалі Буду. Часта будысцкія манахі ішлі да іх святога дрэва на каленах.

У парках было многа кіёскаў з таварамі. Там я купіў сабе невялікі японскі фотаапарат на плёнку. Тады яшчэ электронных фотаапаратаў не было.

За два дні агледзелі мы ўсе храмы і на чацвёрты дзень паехалі ў Гаю, у горад, які ляжыць 100 км на поўдзень ад Патны.

Гая раскінулася над берагам ракі Фалгі (якую ў „Рамаяне" называюць Ніранджана) і з'яўляецца святым месцам як для індусаў, так і для будыстаў. З трох другіх бакоў Гаю акружаюць тры ўзгоркі. Назва горада ўзнікла ад імя дэмана Гаясуры, якога быццам бы бог Вішну прыдушыў сваёй стапой. Быццам бы ад стапы Вішну Гаясура ачысціўся і стаў вызваляць людзей ад грахоў, тых якія да яго дакрануліся ці на яго пагледзелі. Так што цянер прыязджае ў Гаю многа індускіх пілігрымаў, і лічыцца Гая другім святым горадам пасля Варанасі, бо індусы вераць, што калі пройдуць па ўсіх храмах і месцах, якіх тут больш чым паўсотні, і ахвяруюць багам „піндас" (пахавальнае піроўнае), то душы іх продкаў вызваляцца ад увасаблення, пападуць у стан нірваны.

Асноўным храмам у горадзе з'яўляецца Вішнупад, у якім можна пабачыць даршан, адбітак стапы бога Вішну на камяні. Бог Вішну у індусаў з'яўляецца адным з галоўных багоў. Прадстаўляюць яго ў кароне на галаве сідзячага на лотасе ці на міфічнай птушцы гарудзе, ці на вужы сешы, які плавае ў акіяне. Індусы вераць, што бог Вішну ўжо дзесяць раз сыходзіў на зямлю і ўвасабляўся першы раз у рыбу, другі раз у чарапаху, а пасля ў дзіка, у паўчалавека і паўільва, у карліка, у Раму, у Рамачудру, у Крышну і ў Буду.

Калі мы былі, то рака Фалга была сухая, а ў час монсуна ад другой паловы чэрвеня і амаль да верасня напаўняецца вадою.

Дзмітры Шатыловіч ■

Васіль Петручук *Крышынкі*

***66*. Падкідыш.** Я ў сваёй прыроднай нясмеласці стаўся аж бессаромным нахабнікам у адносінах да спадарыні Міраславы Лукшы, што ўжо буду няпрошаным падкідышам. Але якраз у гэтым выпадку слова «няпрошаным» мужу зазначыць двукоссем, бо спадарыня Міра не просіць, каб я пісаў, але прыпамінае. Яна добра ведае, што маю пра што пісаць, але на старасць апанавала мяне такое гультайства, што толькі яшчэ з ахвотай чытаю ды развязваю крыжаванкі.

З другога боку ведаю аб гэтым, што мая пісаніна нікога не цікавіць, нікому не баліць і нікому непатрэбная. Непатрэбная не таму, што нецікавая, а таму, што ад яе заносіць хлуснёй. Ну, бо калі хтосьці з чытачоў і пісьменнікаў, апрача Міры, паверыць у тое, што пабілі мяне за ўтопленую квартачку так, што апухла галава і запухлі вочы, то ніхто не паверыць, што мачыха растаптала кавалачак тварагу, які выляцеў з рота яе сына на падлогу, а я хацеў яго з'есці, або дастаў кулаком па свінячым рыле за тое, што на чарэні ўбачыў пад пялюшкай сушаны сыр і ўкалупнуў яго? Не з'еў, а толькі ўкалупнуў і злякаўшыся што мама пазнае шкоду і наб'е, дык узяў і прыклаў той кавалачак да цэласці і злез з печы. А і так вечарам яна мяне адтрапала. Хіба за тое што знайшоў?

Або пані Міра і нехта з чытачоў паверыць, што я быў смяротна папараным і выжыў, то нават яны не павераць у тое, што ў сорак трэцім годзе разагнаў хрысціны ў нямецкага солтыса ў Елянцы. І хіба слушна, бо гэта праўда такая, што яны, госці, мясцовыя, вокнамі і дзвярыма разбегліся па агародзе і пабеглі за клуню, але я іх не разганяў, бо да іх не страляў, а толькі ішоў з «ружжом» – касою за спінаю па вуліцы. І сярод гасцей было двух жандараў з карабінамі, і таксама ўцякалі. І праўда, што назаўтра падышоў да мяне на вуліцы солтыс Ян Казьмярук і сказаў, памятаю як сёння: «Ты машэйніку, маеш шчасце, што ўстыдаўся іты мэльдоваты жандармэрыі, бо воны показалі бы тобіе партызанку!» І нават небалюча пацягнуў мяне пальцамі за шчаку і пайшоў куды ісці меў. Не аддаў мяне немцам на балючую смерць нават за такую ганьбу. Праўда, што ягоны сын – а былі гэта хрысціны ягонага дзіцяці – Міцька і зяць солтыса Валодзя мсціліся на мяне, калі толькі мяне спаткалі аж да Руздва, калі Валодзя з Кадетчыным – здаецца – Пятром напалі на мяне ў Олі Баравік, і я Валодзю кланіцай палажыў на панадворку як доўгага, а ён за гэта ўстаўшы з зямлі патрапаў акно ў майго гаспадара Маркевіча. А пасля я мусіў шкліць, бо мой гаспадар з солтысам жылі ў добрай камітыве.

Або хтосьці спытаецца ў мяне, адкуль я ведаю, што гаварыў «дурны» Сахар, калі яго на марознай вуліцы білі немцы, а ён гаварыў: «Біетэ, біетэ, а і так будэтэ ўтыкаты тэю дорогою, шчо я вам выбрав!» Ведаю, бо гэта чуў солтыс і пераказаў Маркевічу, а той мне. Гэта я памятаю, а як было на самай справе – то хто яго ведае?

Не дзеля якойсьці прэтэнзіі, а дзеля праўды паўтараю, што няважна што напісана, важна, хто напісаў. Памятаю, як у выдавецтве кааператыва «Чытэльнік» на польскай мове паказалася мая «Пожня» ў тыражы 20 тысяч экземпляраў, то пані Тэрэза Занеўская дзесьці напісала,

што гэтая кніжка яе не зацікавіла ані ўсхвалявала. Мо гэта і недакладна так, але штосьці падобнае. Мне стала неяк сумна і сорамна, бо падумаў, што чытачы маё напісанае ўспрымуць як нейкую хлусню. Бо як магло прыйсці ў галаву не толькі пані Занеўскай такое, што мачыха зрабіла з крышкай сыра. Ёй жа не паняць, што на лаўцы ля акна сядзіць бруднае дзіця ў бруднай доўгай сарочцы і прагнымі вачыма глытае тварог, які мачыха пхае свайму дзіцяці пальцамі ў рот. А калі выпаў кавалачак гэтага ласунку з рота дзіцяці на брудную падлогу, то тая – паводле Устынкі – найлепшая з найлепшых узяла дый наступіла на той сыр нагамі. А мо наступіла ад добрага сэрца, бо тварог упаў жа не на чыстую вышараваную падлогу, а на пясчаную, поўную розных заразкаў і мачыха не хацела дапусціць, каб, праўда, не родны сын, але падапечны – захварэў. А лгун Петручук хоча даказаць якая гэта была дрэнная маці.

Пані Т. Занеўскай, як і цёці Устынцы нават у галаву не прыйшло, што нават мачыха магла гэта зрабіць. А ці яны і такія як яны павераць у тое, што я вышэй сказаў пра гэта, што ўкалупнуў сыр на чарэні пад пялюшкай і таксама вечарам дастаў?

А ці хто паверыць у тое, што засталося ў маёй памяці на ўсё жыццё, калі аднойчы цёця Устынка ў нядзелю ішоўшы ў царкву прынесла мне пруток каўбасы. Увайша ў хату і дала мне ў рукі каўбасу і пайшла, а маці ўзяла ад мяне гэты ласунак і паклала на паліцу. Не пакроіла гэтага ні на абед прыйшоўшы з царквы, ні на вячэру пры мне. А заўтра раніцай смяюцца з бацькам, што каўбасы няма, бо кот з'еў. Ці гэта бацькі? Я не даходзіў нічога і не плакаў, але ведаю, што кот на паліцу не далез. А як бы мала таго, што лгалі, то яшчэ і смяяліся з хітрасці ката і не шкадавалі падарка, які цёця прынесла мне. А калі б я быў разумны як іншыя дзеці, то пабег бы да цёці і сказаў бы як было з каўбасой, то цёця мо памятала б і не сказала б мне ў 1976 годзе, што «Оксэня тэбэ гліедыла лепы своіх дыты, а ты на йіе лжэш», калі я першы раз у жыцці спытаўся ў яе, ці гэта праўда, што па смерці маёй мамы яна забрала пасцель, бо я ўсё жыццё спаў на голай лаўцы і адно куском радна прыкрываўся. Бацькам, асабліва мачысе не прыйшло ў галаву, каб клясці ці біць ката за нібыта з'едзеную каўбасу на маіх вачах, як біла мяне калі я часам ад голаду ўшчыпнуў з-пад абруска шчопаць хлебця. А дзе ж там ёй


Фота Януша Корбеля

перад якімсьці гамняком чагосьці саромецца! Яна нават, як усё на гэта паказвае, у царкве не малілася Богу, каб дараваў ёй фальш, а круціла свечачкі, каб пакруціла мяне. Я нават не ведаю як гэта выглядала, бо не спытаўся ні ў Шэшкавай Аксені, ні Ёсіпавай Парасkі, якія мне аб гэтым сказалі.

Майго гора ніхто нават з тых хто часта пра мяне пісаў, нячаста спалучаў з людзьмі з каменным сэрцам і без капейкі дабрыні сукі, якая ва ўсім звярыным свеце дзеліцца такой ежай, якую есць сама, а адносілі да сітуацыі такой, што ў Польшчы многім так бедна жылося. Калі я наракаў на басаногае сваё жыццё калі тэба было пераносіць халодную расу, замаразкі, калецтвы ад заржавелых цвікоў, шкла, рознага тыпу вострых прадметаў у лесе і да белых касцей палопаных пятак, то сярод нашых паэтаў і песеннікаў, а не то так званых простых людзей, некаторыя мне гаварылі, што і яны хадзілі басанож. Адзін з іх мне сказаў, каб я перастаў пісаць аб сваёй бядзе, бо гэта ўжо нямодна. Людзі чакаюць ад нас чагосьці новага. Я яму нічога не сказаў, але сам ведаю і вам скажу, што пры ягоных зусім нябедных і добрых, разумных бацьках ён мог хадзіць у хромавых чобатах таты тады, калі мне ніхто не паклапаціўся пра нейкія хадакі-лапці, або хаця б аб анучы, і то было б добра, а сённяшні прафесар бегаў басяком, бо ў народзе была такая мода.

Хаця ў мяне, як у пазнейшага пастушка ці нянькі залёг такі відок у маёй памяці, што ў дубіцкую царкву не ўсе хадзілі боса, як і не ўсе – абутымі. Некаторыя неслі абутак у руках, а абуваліся ля парога храма. А памятаю такі момант, хіба гэта было на Юр'я, што ішла працэсія з Грабаўца ў Дубічы, у якой я меў шчасце, не ведаю чаму, прыняць удзел. Памятаю, што ўсе людзі былі абутымі, то я баяўся ісці сярод іх дарогаю, каб не быць пакалечаным іхнімі чаравікамі ці ботамі, дык бег усю дарогу ўпоперак прыдарожных загонаў. Баяўся дадатковых боляў.

(Працяг будзе)



Рэцэнзіі, прэзентацыі

Zapis odchodzącego świata

Projekt „Ławaczka” to filmowa dokumentacja zanikającego oblicza wsi białoruskich Białostocczyzny w retrospektywie minionego półwiecza. Jest to zapis wspomnień i refleksji sędziwych mieszkańców w wyludnionych już miejscowościach. Przed kamerą Michała Grzesia z Gródka opowiedzieli – *pa prostu, pa swojmu* – jak wyglądały ich wsie w czasach młodości, opisali dawne życie codzienne, zwyczaje rodzinne i ludowe obrzędy. Następnie skonfrontowali to ze smutnym stanem obecnym, gdy z tamtego gwarnego i barwnego świata prawie nic już nie zostało.

Wypowiadające się w filmie osoby siedzą na ławce (stąd tytuł projektu), stojącej przed domem przy płocie od ulicy. Niegdyś był to charakterystyczny element wiejskiego krajobrazu. Ławeczki dawały chwilę wytchnienia mieszkańcom od ciężkiej pracy w gospodarstwie, były miejscem spotkań, rozmów i wymiany poglądów, a nawet śpiewania piosenek, muzyki i tańców. Koncentrowało się tam wiejskie życie. Dziś ławeczek we wsiach jest już niewiele, a i te stoją najczęściej puste. Tylko w słoneczne dni gdzieniegdzie można tam spotkać siedzących staruszków, przeważnie samotnych.

Filmowy dokument, który powstał w rezultacie projektu, zawiera dwanaście reportaży, zrealizowanych we wsiach Chomontowce, Nowosiółki, Gobiaty (gmina Gródek), Ozierany Wielkie, Nietupa, Rudaki (gmina Krynki), Ochrymy, Olchówka, Michnówka (gmina Narewka), Białowieża, Krzyże, Białowieża Stoczek, Teremiski (gmina Białowieża). Zostały nagrane na płytach DVD, przekazanych osobom, które wystąpiły przed kamerą oraz ośrodkom kultury, szkołom i bibliotekom w poszczególnych gminach.

Projekt zrealizowało Gminne Centrum Kultury w Gródku (dzięki dotacji Ministra Administracji i Cyfryzacji). **(jch)**



Fot. Jerzy Chmielewski

Reportaże z projektu „Ławaczka” w grudniu pokazane zostały w domach kultury w Gródku (na zdjęciu), Krynkach, Narewce i Białowieży

Nowa książka



Nakładem Wydawnictwa Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej w Lublinie ukazała się książka współpracującej z „Cz” dr Agnieszki Goral „Derywacja sufiksalna osobowych nazw subiektów czynności w języku białoruskim”. Książkę można zamówić na stronie internetowej Wydawnictwa UMCS pod adresami:
www.wydawnictwo.umcs.eu
www.wydawnictwo.umcs.lublin.pl

Шчасьце ў Вільні

Пра Канстантага Ільдэфонса Галчынскага размова Лены Глагоўскай з беларускім паэтам Леанідам Дранько-Майсюком

60 гадоў таму назад – 6 сьнежня 1953 г. у Варшаве памёр выдатны польскі паэт Канстанты Ільдэфонс Галчынскі, які нарадзіўся ў гэтым жа горадзе 23 студзеня 1905 г. 1 чэрвеня 1930 г. ажаніўся з Натальляй Авалаў, бяручы з ёй шлюб у царкве ў Варшаве. У 1933 г. выехаў у Вільню, дзе жыў на вуліцы Млыновай 2 на Зарэччы. Там 26 красавіка 1936 г. нарадзілася яго дачка Кіра. У ліпені 1936 г. Галчынскія пераехалі ў Варшаву. Тры гады жыцьця ў Вільні былі вельмі плённымі для К. І. Галчынскага – пісаў там сатырычныя і лірычныя вершы, супрацоўнічаў з Польскім радыё ў Вільні, пішучы для яго сатырычныя фэльетоны і праграмы. Тады таксама ў верасьні 1933 г. у Вільню вярнуўся з Саловак беларускі драматург і сатырык Францішак Аляхновіч. Маю ўражаньне, што пісьменьнікі неаднойчы сустракаліся ў Вільні – у багемнай Кавярні Літарацкай ды ў радыё...
У 2006 г. у Мінску выйшаў зборнік паэзіі К. І. Галчынскага „Сёмае неба” ў перакладзе на беларускую мову. Адным з перакладчыкаў і аўтарам уступу да яго быў беларускі паэт Леанід Дранько-Майсюк, з якім прапаную размову чытачам „Czasopisa”.


Леанід Дранько-Майсюк

Лена Глагоўская: **„Шчасьце ў Вільні” – такі загаловак аднаго з вершаў К. І. Галчынскага. Мне здаецца, што ўсе мы ў Вільні шчасьлівыя – вядома кожны па свойму. Як гэта здарылася, што беларускі паэт стаў перакладаць польскага паэта?.. Мала хто ведае, што некалі ў 30-ыя гады XX стагодзьдзя хадзіў ён па віленскіх вуліцах – як мы зараз – і ствараў лірычныя і сатырычныя вершы...**

Леанід Дранько-Майсюк: Так, і рамантычныя і нерамантычныя беларусы, трапіўшы ў Вільню, адчуваюць сябе шчасьлівымі. Першыя – шчасьлівыя таму, што лічаць Вільню духоўна сваёй. Другія радуюцца не менш, бо ў Вільні ёсць іхні любімы „Акропаліс”… Паэзію Галчынскага, які сапраўды нейкі час жыў у Вільні і працаваў на радыё, я адкрыў для сябе, можна сказаць, выпадкова. Драматург Сяргей Кавалёў пакінуў мне кніжку ягоных вершаў. Неяк я зазірнуў у гэту кніжку і пэўныя старонкі захацеў пераказаць па-беларуску.

Паэзія Галчынскага ўзбагаціла Тваю творчасьць?

– У мяне ёсць кніга „Стомленасьць Парыжам”, у якой сярод іншых вобразаў выведзены і вобраз паляка-эмігранта. Чалавек гэты яшчэ да вайны, да 1 верасня 1939 года, трапіў у Парыж. Любімым паэтам ягоным быў менавіта Галчынскі. Ствараючы жыцьцяпіс польскага эмігранта, я паволі і адкрываў для сябе ў пачатку 1990-ых гадоў паэзію Галчынскага. Так што можна сказаць: вершы вялікага паэта ўзбагацілі маю творчасць самым непасрэдным чынам.

Ягоныя вершы ты не вывучаў у школе, не то што мы ў Польшчы, дзе К. І. Галчынскага трактавалі як класіка літаратуры. Як ты яго для сябе раскрыў? Трапіў на ягоныя вершы выпадкова? Успомні пра сваю першую сустрэчу з Галчынскім – ці спярша быў паэт, ці ягоная паэзія?

– Вядома, у школе я не чуў пра такога творцу. Але калі вучыўся ў маскоўскім Літаратурным інстытуце, даведаўся – ёсць у сусьветнай паэзіі такое імя! Дык вось, спачатку адкрылася мне імя, а вершы – значна пазней.

Чым Цябе захапілі вершы Галчынскага?

– Яны як віно, ад гэтых вершаў п’янееш. Магчыма, нават і не трэба віна. Дастаткова прачытаць той ці іншы твор Галчынскага, каб адчуць у душы сапраўдную вінную асалоду! І гэта добра, бо не сап’ешся!

А ці можаш згадаць, ад якіх ты найбольш „п’янееш” і што ў іх такое, што натхніла Цябе на чытаньне іх і пераклады?

– Мне найбольш падабаюцца „Заручыны Джона Кітса”, а таксама вершы пад назвай „Фарляндыя”, „Каханая”, „Гадзіннік з ланцужком”… Здаецца, што творы Галчынскага ні на што не падобныя! Яны – як сама прырода! На што падобныя зоркі? На зоркі! На што падобная крынічная вада? На крынічную ваду! Асноўная якасць творчасьці Галчынскага заключаецца ў тым, што гэта творчасьць заўсёды стварае добры настрой!

Ты з’яўляешся аўтарам уступу да зборніка вершаў К. І. Галчын-



скага выдадзенага на беларускай мове ў Менску ў 2006 г. Чаму менавіта Табе было даручана гэтае заданьне? З уступу вынікае тваё блізкае знаёмства не толькі з ягонай паэзіяй, але і з ягоным лёсам. Што ў яго жыцьці і творчасьці самае блізкае Табе як паэту?

– У 1990-ыя гады ў Менску існаваў цудоўны часопіс „Крыніца". Рэдактарам „Крыніцы" быў выдатны паэт Уладзімір Някляеў. У гэтым „някляеўскім" часопісе, у рубрыцы „Постаці", зьмяшчаліся жыцьцяпісы і творы знаных дзеячоў, беларускіх і замежных. Аднойчы, пад добры настрой, для „Крыніцы" я напісаў пра Галчынскага маленькі нарыс і пераклаў тыя вершы паэта, якія спадабаліся з першага – імгненнага! – чытаньня. Тады, пэўна ж, і зьвярнуў увагу на мой нарыс Андрэй Хадановіч. Пазней яму прапанавалі выдаць Галчынскага па-беларуску. Так мой нарыс ператварыўся ва ўступ да кнігі выбраных твораў паэта „Сёмае неба".

Хто быў ініцыятарам выданьня Галчынскага па-беларуску?

– Мусіць жа, амбасада Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь і Польскі інстытут у Менску. Уклаў і адрэдагаваў кнігу А. Хадановіч, ён жа сабраў і перакладчыкаў – акрамя сябе яшчэ і Лявона Баршчэўскага, В. Болбаса, Г. Герасіну, Інэсу Кур'ян, Марыйку Мартысевіч, Сержа Мінскевіча, Натальлю Русецкую, Марыну Шоду. У кнігу былі ўключаны таксама і пераклады, якія раней зрабіў Алег Лойка.

І як жа ўспрыняўся К. І. Галчынскі ў Беларусі чытачамі, літаратармі і літаратурнай крытыкай? Ці заіснаваў польскі паэт у беларускай літаратурнай прасторы, ці толькі стаўся блізкім ягоным перакладчыкам?

– Як успрыняўся Галчынскі нашымі чытачамі і літаратарамі? Не ведаю. Аднак жа добра, што гэта кніга выйшла. Ёсць чым пахваліцца – у тым сэнсе, што вось, калі ласка, маем Галчынскага па-беларуску. Кніга „Сёмае неба" – аддзяка Галчынскаму за тое, што ён у 1930-ыя санацыйныя гады даваў магчымасьць беларускай песні гучаць у эфіры польскага радыё!

Дзякую за размову і жадаю Табе шчасьця не толькі ў Вільні. ■

Канстанты Ільдэфанс Галчынскі (1905-1953) – вандроўны дэндзі

Любіў імправізацыі, пакланяўся мастацтву раптоўнасці. Імправізаваў у жыцці і ў творчасці. Аднак у жыцці гэтым мастацтвам, бадай, займаўся найбольш…

Ажаніўся з непаўналетняй Наталляй. Бацькі Наталлі згоду на шлюб не далі.

Але шлюб адбыўся.

І не ў касцёле. Паляк Канстанты Галчынскі прывёў сваю каханую (грузінку па бацьку і расіянку па маці) у праваслаўную царкву…

Любіў у кабарэ іграць на скрыпцы; быў далікатны, нават далёкія ад паэзіі людзі пазнавалі ў ім паэта – *артыста* ...

Шпацыруючы па вечаровай Варшаве, уголас размаўляў з Блокам…

Фліртуючы, ужо адным сваім голасам мог ператварыць жанчыну ў шчаслівую дзяўчынку…

Амаль усе свае лірычныя вершы прысвячаў жонцы, аднак жа не быў адналюбам.

Дачка Кіра ўспамінала: „Ці былі іншыя жанчыны? Былі. З'яўленне ў чэрвені 1990 года блакітнавокага мужчыны, які прызнаўся: „Я – Костак Галчынскі, твой брат", – яскравы доказ, што іншыя жанчыны існавалі. Аднак Наталля была адзіная, да якой вяртаўся…"

Атрымаў усебаковую філалагічную адукацыю і прачытаў неймаверную колькасць кніжак на розных мовах…

Паэт з ласкі боскай, аднак жа першую кніжку выпусціў празаічную – аповесць „Парфірыён Вослік, або Клуб блюзнерцаў"…

Прыдумаў сабе другое імя – Ільдэфанс; прыдумаў сярэдневяковага англійскага паэта Морыса Гордана Чыйтса, у існаванне якога паверыла прафесура Варшаўскага ўніверсітэта; прыдумаў краіну Фарляндыю…

У Берліне па-французску напісаў раман „Святло поўні" і рукапіс рамана згубіў.

Гэтак жа легкадумна, як да рукапісаў (з напісанага згублены быў не толькі раман), ставіўся і да сваёй пасады рэферэнта па культуры ў Польскім Генеральным Консульстве ў Берліне…

Улюбёнец лёсу і адначасова ахвяра…

Зведаў пяшчоту альковаў і лагерныя нары…

Быў смелы, але знарок сваёй смеласцю не выхваляўся.

У 1947 годзе ў камуністычна-каталіцкай Польшчы публічна прызнаўся, што ён ні католік, ні марксіст…

Умеў цаніць творчую адзіноту…

Ні над кім з паэтаў-сучаснікаў не ўзносіўся, хаця адрозніваўся ад усіх…

Адсутнасць у характары фанабэрыі і самаўлюбё-

насці не дае падставы назваць яго польскім Оскарам Уайльдам…

У паэзіі XX стагоддзя ён – вандроўны дэндзі…

Ад суму бараніўся летуценнямі, ад беднасці – іроніяй, ад лішку грошай – замежнымі вандроўкамі, ад жаху свайго часу – каханнем, ад самога сябе – паэзіяй…

Канстанты Ільдэфанс Галчынскі

Каханая


Бракуе грошай на машыну,
каханая.
Спяшаюцца ў машынах дурні,
а пешшу ўсё ж хадзіць культурней,
каханая.

Бракуе грошай і на Лондан,
каханая.
Што?! Лондан – радасць? Лондан – гора:
ў „Paris-Soir” чытаў я ўчора,
як атруціў маркіз спрасонку
сабачай макаронай жонку…
На чорта здаўся такі нам Лондан,
каханая.

Крамлёўская ікра, асётры,
вядома, не для нас таксама.
Навошта Крэмль – ёсць твае бёдры!
І ноч, і ўтулле сіняй коўдры,
віно, і пацалункаў многа,
і грошы на рахунку ў Бога.
Плюй на машыну, Крэмль і Лондан,
каханая.

1934

Пераклад з польскай мовы Леаніда Дранько-Майсюка.



Радкі з лістоў, адгалоскі

Swego się nie wyrzekniemy

We wrześniu ub.r. w „Głosie Siemiatycz” ukazał się artykuł z alarmującym tytułem „Drohiczyn zbankrutuje?”. W moje ręce trafił niedawno i przeczytałem go z ogromnym zainteresowaniem. Jest to dziennikarskie sprawozdanie z posiedzenia rady gminy, której przewodniczył burmistrz Drohiczyna Wojciech Borzym. Było ono poświęcone zwrotowi Cerkwi odebranych jej po I wojnie światowej nieruchomości. Chodzi o 153 hektary ziemi, które wyceniono na 5,5 mln zł. Burmistrz apelował, by gruntów nie zwracać, gdyż – jak argumentował – nie są to żadne grunty pocerkiewne, tylko pokościelne, a ich utrata doprowadzi gminę do upadłości.

A przecież cerkiewne nieruchomości w Drohiczynie i na etnicznie ruskim Podlaszu są nierozerwalnym składnikiem staroruskokijowskiego obszaru historyczno-kulturowego, który co najmniej od VII wieku zamieszkują bużańscy Rusini, przybyli tu z Wołynia i Polesia. Drohiczyn, Mielnik, Bielsk, Brześć, Brańsk, Suraż i nawet Siemiatycze były grodami ruskimi. W Drohiczynie, wg. o. Grzegorza Sosny, było aż 18 cerkwi parafialnych i monasterskich i do początku XV wieku ani jednego kościoła. Tu w 1253 roku książę Rusi Halicko-Wołyńskiej, Daniel Romanowicz, był koronowany na króla Rusi. Tu urzędowali ruscy i prawosławni książęta i biskupi. Tu były ich siedziby i ziemia, którą odwiecznie władali, i którą my prawosławni nieprzerwanie do dziś zasiedlamy.

Radnym gminy Drohiczyn i burmistrzowi Wojciechowi Borzymowi radzę, aby zapoznali się z książką o. Grzegorza Sosny i m. Antoniny Troc-

Sosny „Cerkiewna własność ziemska na Białostocczyźnie w XV-XX wieku” – zbiorem materiałów źródłowych, gdzie str. 116-125 są całkowicie poświęcone sprawom drohickiej własności cerkiewnej. W tej książce są wymienione wszelkie zachowane w Polsce i za granicą dokumenty dotyczące własności ziemskiej Cerkwi w tym mieście i okolicach, poczynając już od początków XVI wieku. W wielu przypadkach autorzy podają nawet nazwiska i imiona poszczególnych darczyńców oraz co i kiedy do majątku Cerkwi ofiarowali. Zacytuję dla przykładu (str.117): „(...) 14 maja 1638 roku Andrzej Żółkowski i jego żona, Katarzyna Grygłowa, zapisują monasterowi dwa uczastki zemli w Gorodie Drohiczyn; 3 kwietnia 1641 roku Lawrentij Nikołajewicz Jarmochowicz zapisuje temu monasterowi uczastok zemli”. Najstarszy zachowany dokument o zakupie ziemi dla cerkwi monastyrskiej św. Spasa pochodzi z 12 stycznia 1548 roku i mówi o zakupie „uczastka” ziemi od Nestora przez o. Iwana, „swiaszczennika” tej cerkwi w Drohiczynie. Późniejszych, jeszcze z tego samego wieku, jest całe mnóstwo. Z 1563 roku zachował się dokument o wydzieleniu z gruntów miejskich dla tej cerkwi dwóch włók i sześciu morgów ogrodów. Własność ziemska Cerkwi w Drohiczynie była potwierdzona przez wielkich książąt litewskich i królów polskich, choćby przez Władysława IV w 1644 roku oraz przez późniejszych władców I Rzeczypospolitej, Królestwa Pruskiego i Cesarstwa Rosyjskiego. Dopiero niepodległa Polska w 1918 roku bezprawnie konfiskuje tę własność naszej Cerkwi „błahowieszczywoj” na rzecz Skarbu Państwa. W 1920 roku polskie władze prawosławną parafię w Drohiczynie rozwiązały, by po czterech latach drohicką cerkiew zburzyć jako „nieużywaną i niepotrzebną”. Jej dobra jako „dobra martwej ręki” rozgrabiono. Wszystko to jest udokumentowane.

Tymczasem teraz burmistrz Borzym na sesji rady gminy w Drohiczynie mówi: „(...) A wracając do dokumentów, to nigdzie nie ma dostatecznych zapisów, że działki, których się domaga Kościół prawosławny należały prawnie do Cerkwi (...)”.. To właśnie jego prawno-administracyjne działania już od pięciu lat skutecznie blokują i przewlekają wydanie pozytywnej dla Cerkwi decyzji Komisji Regulacji ds. PAKP o zwrocie zagarniętych w okresie międzywojennym jej nieruchomości w Drohiczynie.

Z ogromnym wzburzeniem i głosem wewnętrznego sprzeciwu czytam słowa wypowiedziane na sesji rady gminy: „(...) Jedynym wyjściem jest obrona teraz. Moim zdaniem, jak i instytucji, które są we władaniu nieruchomości, których domaga się Polski Autokefaliczny Kościół Prawosławny – nie powinniśmy oddawać (...)”.

I dalej: „(...) Zapłacą za to wszyscy mieszkańcy naszej gminy. I katolicy, i prawosławni, świadkowie Jehowy i ateiści, wszyscy. Mnie jako burmistrza prawo zobowiązuje do dbania o interes gminy (...)”.

Pytam zatem burmistrza: A kiedy te nieruchomości przejmowano, to kto się na tym najbardziej wzbogacił? Prawosławni, czy też interes gminy i jej katoliccy mieszkańcy?

Na marginesie, Kościołowi rzymskokatolickiemu w Drohiczynie zwrócono wszystko co do joty, a nam, prawosławnym Rusinom, wymachuje się pięścią przed oczyma od pięciu lat.

Skarb Państwa II RP wszedł w posiadanie majątku Cerkwi w Drohiczynie jako zwykły grabieżca i burzyciel prawa naturalnego. Bo to nie jest i nie było żadne mienie „pocarskie” lub Cerkwi rosyjskiej! To jest mienie naszej Cerkwi i nas tutejszych Rusinów. To jest niezbywalna nasza wartość społeczna. I jej się nie wyrzekniemy!

Uczciwość i sprawiedliwość nakazuje, aby poszkodowanemu zwrócić jego naturalny majątek, a za składniki go uszczuplające i zniszczone wypłacić stosowne odszkodowanie, niechby nawet w długoletnich ratach, aby dla miasta i gminy nie były zbyt uciążliwe.

***Jerzy Wolski**,*
Białystok

Prenumerata „Cz” na 2014 r.

Serdecznie zachęcamy do prenumeraty naszego pisma. Cena jednego numeru jest niższa niż w sprzedaży detalicznej.

Przypominamy, że wystarczy odpowiednio do liczby zamawianych egzemplarzy i okresu prenumeraty wpłacić wielokrotność **4 zł** (w cenie zawarty jest już koszt wysyłki) na rachunek Stowarzyszenia Dziennikarzy Białoruskich w Banku PEKAO S.A.:
30 1240 5211 1111 0000 4928 9343.

Wpłat można dokonać zarówno przelewem z własnego konta, jak i gotówką na poczcie lub w banku. W tytule operacji należy podać dokładny adres, na który ma być wysyłany „Cz”.

Mam do nich żal

Bywając na każdym plenum Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego (jako członek władz tej organizacji), słyszałem ciągłe narzekania kierownictwa na środki masowego przekazu. Uważam, że ci ludzie wciąż nie mogą zrozumieć, że media od dawna są niezależne. Nie można, jak za czasów PRL, nakazać im pisać i pokazywać BTSK tylko z dobrej strony. Teraz na przychylność mediów trzeba zasłużyć. Nie mogą być one na usługach BTSK, bo ich rolą jest obiektywny przekaz informacji. Nie mogą tak tańczyć, jak im BTSK zagra. Kierownictwo powinno też czasem spojrzeć i na siebie krytycznie, a nie manipulować innymi. Bo zauważyłem, że kto posłuszny to jest dobry, a kto ma inne zdanie niż kierownictwo, natychmiast jest odseparowywany.

***Konstanty Masalski**,*
Białystok



Czym różni się Zabłotczyzna od innych podlaskich wsi? Wydaje się, że niczym szczególnym. Wciśnięta gdzieś na uboczu w otulinę Puszczy Białowieskiej, z drewnianymi domkami i krzyżem przydrożnym. Dymów liczy dwadzieścia cztery, opustoszałych domów popadających w ruinę – trzy. Dwóch rolników prowadzących specjalistyczne przedsiębiorstwa rolne. Trzy domy zamienione przez warszawiaków na dacze letniskowe. Jedna agroturystyka. Młodzieży – kilkoro...



Міхась Міpановіч сёння даволі папулярны сатырык на Беларусі. Яго друкуюць выданні, найбольш дэмакратычных поглядаў, ён часта выступае сярод моладзі, выдаюцца яго кнігі. Нарадзіўся паэт на Ушаччыне ў вёсцы Старына 65 гадоў таму. Скончыў Львоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Івана Франко. Працаваў лабарантам, выкладчыкам, інжынерам-канструктарам, інспектарам дзяржнагляду за стандартам, начальнікам... (dalej w następnym numerze)

Czasopis

Nr indeksu 355038, ISSN 1230-1876.
Wydawca: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich.
Adres redakcji:
Białystok, ul. Lipowa 4/221.
Adres do korespondencji:
„Czasopis", 15-001 Białystok, skr. p. 262. **E-mail**: redakcja@czasopis.pl
http://czasopis.pl
Tel. (85) 653 79 66

Redaktor naczelny: Jerzy Chmielewski, tel. 502 661 316.
Zespół redakcyjny: Wiesław Choruży, Helena Kozłowska-Głogowska, Sławomir Iwaniuk, Tomasz Sulima (sekretarz redakcji), Jerzy Sulżyk.
Stali współpracownicy: Piotr Bajko (Białowieża), Siarhiej Czyhryn (Słonim), Tamara Bołdak-Janowska (Olsztyn), Agnieszka Goral (Lublin), Mirosława Łuksza, Janusz Korbel (Białowieża), Aleksander Maksymiuk, Jan Maksymiuk (Praga), Michał Mincewicz (Orla), Dorota Wysocka.
Druk: Orthdruk, Białystok.

Prenumerata: Odpowiednio do liczby zamawianych egzemplarzy i okresu prenumeraty należy wpłacić wielokrotność 4 zł na rachunek: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich: Bank PEKAO S.A. Białystok 30 1240 5211 1111 0000 4928 9343.



Беларускі грамадска-культурны часопіс, прысвечаны пытанням сучаснасці, гісторыі, літаратуры і мастацтва, месца чалавека ў свеце. Форум думкі беларусаў і ўсіх тых, каму блізкая беларуская тэматыка. Пазіцыі аўтараў тэкстаў не заўсёды адпавядаюць пазіцыям рэдакцыі. Не публікуюцца матэрыялы, якія прапагандуюць камуна-фашызм, расізм, нацыянальную варожасць.
Artykuły i listy publikowane są – o ile autor nie życzy sobie inaczej – w języku oryginału: po polsku lub białorusku. Redakcja zastrzega sobie prawo do skrótów, zmian tytułów i redagowania nadesłanych tekstów.

Materiałów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Administracji i Cyfryzacji.

Numer złożono 23 grudnia 2013.